Набліжаецца лес ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Вільня ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 24 (2770) Год LIV | Беласток, 14 чэрвеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Славяне, балты, вікінгі...

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Пастаноўкі раннесярэднявечных бітваў і сутычак з верасня 1939 г. з прымяненнем піратэхнікі, паказы коннай стральбы з лука, каштаванне колішніх страў, на канец канцэрты гуртоў старадаўняй музыкі — гэта толькі некаторыя атракцыёны першага гістарычнага пікніка „Ад слявян да жаўнераў верасня", які ў суботу 6 чэрвеня прыцягнуў гледачоў і ўдзельнікаў у падбеластоцкі Музей вёскі.

Мерапрыемства сарганізавалі Дэпартамент культуры і нацыянальнай спадчыны Падляшскай маршалкоўскай управы пры саўдзеле Падляшскага музея ў Беластоку ў рамках Падляшскіх дзён спадчыны. Дырэктар дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Анатоль Вап так тлумачыў „Ніве" ягоныя мэты:

— Гэтая ідэя выспявала ўжо два гады. Гаворка была перш за ўсё аб тым, каб паказаць нашым жыхарам жывы ўрок гісторыі: як калісь людзі апраналіся, як жылі. Значыць, маем тут мілітарныя паказы, але таксама і прэзентацыю рамёстваў.

Можна было пакаштаваць праснакоў з ячной кашай і грыбамі, рыхтаваных на вогнішчы, паглядзець пастаноўкі сярэднявечных бітваў, падрыхтаваных згодна з канонамі ваеннага майстэрства, напрыклад, гэтак званымі кругамі здрады і гонару. Змагаліся падляшскія ваяры з ваярамі „рэшты свету". Групы гістарычнай рэканструкцыі з Беларусі, Літвы ды Вялікабрытаніі прэзентаваліся таксама пад адмыслова разбітымі палаткамі. Былі вікінгі, англасаксонцы, старадаўнія балты, дружыны раннесярэднявечных славян, рыцары ордэна тампліераў і іншыя разнамасныя воі, але таксама і шляхта, легіянеры Юзафа Пілсудскага, кавалерыя, гітлераўскія войскі. Кожная з груп прэзентавала ўсё што яе адрознівала: ад строяў да ваеннага і штодзённага абсталявання. Кожны стараўся таксама па спосабе паводзін выказаць клімат таго часу і атачэння, на якія кожная група спасылалася. Уражанне, асабліва на дзятве, зрабілі рослыя і пагрозлівага выгляду ваяры з англійскага атрада нямецкай дружыны „Ульфеднар", якія іграліі ролі вікінгаў і англасаксонцаў з VI-XI стагоддзяў. З Мінска прыехалі дзве групы з некалькіх чалавек: „Верная дружына" („True Varing") і „Вітланд". Першая з іх гэта клуб вайскова-гістарычнай рэканструкцыі балтыйскага рэгіёна Латгаліі і Заходняй Дзвіны IX-XI стагоддзяў. Павел з „Вітланда" (прыехала чатырох ваяраў) расказаў „Ніве":

— Займаемся рэканструкцыяй жыцця вікінгаў IX-XI ст. Вікінгі, як і славяне, з'яўляюцца нашымі продкамі, таму займаемся вывучаннем іх гісторыі і культуры; каб зразумець сучаснасць, трэба ведаць мінулае. Адрозненне ў паводзінах продкаў старадаўніх скандынаваў ад продкаў тагачасных беларусаў бачу толькі ў акалічнасцях, якія прывялі да таго, што скандынавы мусілі заваёўваць. Землі славян, беларусаў, былі больш урадлівыя, таму не мусілі яны ісці ў паходы, каб здабываць тэрыторыі, гарантуючыя спажыву. Мне здаецца, што якраз ад прыродных умоў залежыць таксама менталітэт людзей тадышняга часу.

З інфармацый членаў „Вернай дружыны" і „Вітланда" вынікае, што ў Беларусі дзейнічае каля дзесятка падобных груп, гуртуючых каля 150 асоб. Несумненна, атракцыёнам пікніка былі канцэрты — люблінскага трыо „Perceval" („новая хваля цяжкага фольку"), але перш за ўсё беларускага гурту „Стары Ольса". Заснаваны ён быў дзесяць гадоў таму цяпершнім яго лідарам Зміцерам Сасноўскім і сёння з'яўляецца ўжо легендай. У яго складзе шэсць асоб. Галоўным чынам рэканструюе ён музычныя традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. Выкарыстоўвае ў сваіх выступленнях стандартныя беларускія музычныя інструменты такія як ліра, дуды (валынка), гуслі, свірэль, варган, сурма, берасцяная труба, гудок. Ад 2003 г. з гуртом супрацоўнічае ансамбль танцораў „Яварына", паказваючы народныя танцы з усёй Еўропы XVI-XVIII ст.ст. Маладыя танцоры ў час пікніка з поспехам захапілі да танца таксама публіку, прытым рознага ўзросту.

Медыйны патранаж над пікнікам „Ад славян да жаўнераў верасня" трымалі м.інш. „Ніва" і Радыё „Рацыя".

Дырэктар дэпартамента культуры і нацыянальнай спадчыны Анатоль Вап так тлумачыў мэты мерапрыемства

Адказнасць за... ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Беларусы любяць ганарыцца, што менавіта наша краіна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Пры гэтым геаграфічны цэнтр успрымаюць увогуле як цэнтр усяго на свеце, нават не задумваючыся што такое сённяшняя Еўропа, як фармаваліся еўрапейскія каштоўнасці і ці адпавядае менталітэт цяперашняга беларуса гэтым крытэрыям. Прыкладам, адносіны да смяротнага пакарання...

Свята дзяцей і мастацтва ☞ 2

Міра ЛУКША

Адчыніліся адкрытыя дзверы маляўнічага будынка Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку (вул. Модлінская, 2) 1 чэрвеня — у Міжнародны дзень дзіцяці не толькі перад дзяцьмі. Галоўным госцем быў Віктар Швед са сваёй новай — чатырнаццатай кнігай — „Смяшынкамі", якому пайшоў ужо 85 год...

Ці бедным вецер у вочы? ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

Харавое двухгалоссе ☞ 8

Ілона КАРПЮК

Завяршэнне, адзнакі, тэатр... ☞ 12

Міра ЛУКША

Адказнасць за...

Беларусы любяць ганарыцца, што менавіта наша краіна знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Пры гэтым геаграфічны цэнтр успрымаюць увогуле як цэнтр усяго на свеце, нават не задумваючыся што такое сённяшняя Еўропа, як фармаваліся еўрапейскія каштоўнасці і ці адпавядае менталітэт цяперашняга беларуса гэтым крытэрыям. Прыкладам, адносіны да смяротнага пакарання. Беларусь — адзіная краіна ў Еўропе, дзе смяротнае пакаранне яшчэ не адменена. Мала таго, беларуская грамадскасць прагаласавала за гэта на рэферэндуме, які ініцыявала ўлада. Прычыны, як заўсёды, у кожнага свае.

Адны сцвярджаюць, што смяротная кара — гэта проста аднаўленне справядлівасці. Маўляў, калі нейкі чалавек забіў іншых людзей, то чаго шкадаваць яго. Праўда, пры гэтым дабаўляюць, што смяротнае пакаранне павінна прысуджацца тады, калі віна абвінавачанага даказана, тым самым прызнаючы факт, што іншыя пакаранні можна да людзей прымяняць і тады, калі віну даказаць немажліва.

Гэтую катэгорыю людзей справядлівасць увогуле не цікавіць. Для іх справядлівасць — рашэнне ўлады. Яны добра ведаюць, што практычна любая ўлада мае магчымасць выкарыстаць смяротнае пакаранне забіўшы невінаватага, каб схаваць сапраўднага злачынцу. Але прымаюць гэта як належнае.

Іншыя выступаюць за смяротнае пакаранне таму, што не хочуць плаціць сваіх грошай на ўтрыманне ў турме чалавека, якога можна проста расстраляць. Яны не разумеюць, чаму мусяць за кагосьці несці адказнасць у выглядзе вялікіх выдаткаў, калі дастаткова аплаціць адзін патрон.

Калі ім гаворыш, што кожны з нас нясе адказнасць за тое, што робіцца ў грамадстве, яны проста адмахваюцца, сцвярджаючы, што кожны нясе адказнасць за сябе. І нават не хочуць задумацца, што сённяшні злачынца жыў сярод іх. І яны бачылі, як жыццё таго па розных прычынах ідзе шляхам злачынстваў. Бачылі, але нічога не рабілі. Жыццё чужога ім чалавека іх не цікавіла тады і не цікавіць цяпер, таму яны хочуць яго проста забіць. І ім не важна, што дзеля выканання гэтага прысуду хтосьці яшчэ павінен стаць забойцам, бо і гэтае забойства зноў робіцца чужымі рукамі.

Ёсць і такія, якія разглядаюць смяротнае пакаранне як элемент запалохвання злачынцаў. Як бізун, баючыся якога злодзей не ўкрадзе, забойца не заб'е, падманшчык не падмане, а чужаложнік пойдзе спаць не да каханкі, а да каханай, нават калі яе і не кахае.

Аргументы пра тое, што ў сярэднявечнай Еўропе найбольш крадзяжоў рабілася тады, калі зявакі глядзелі як на плошчы караюць смерцю злодзея, да гэтай катэгорыі прыхільнікаў смяротнага пакарання не даходзяць. Гэтак жа, як і даўно даказаная ісціна, што не жорсткасць кары, а непазбежнасць яе прымушае парушальнікаў права задумацца пра будучую кару.

Аналізуючы гэтыя факты, можна зрабіць выснову, што беларускае грамадства сёння выхоўваюць менавіта на гэтых трох кітах — страх перад уладай, нежаданне браць адказнасць на сябе за тое, што адбываецца ў грамадстве, і нежаданне бачыць рэальнасць у яе сапраўдным святле.

І гэтыя якасці выхоўваюць сёння ў беларускім грамадстве штучна. Кожны юрыст, які закончыў юрыдычную ўстанову, выдатна ведае, што колькасць злачынцаў у грамадстве вымяраецца ўмовамі існавання таго грамадства. Але прыйшоўшы працаваць ва ўладу, гэтыя юрысты чамусьці забываюцца пра тое, чаму іх вучылі, і наўмысна хаваюць ад грамадства той факт, што колькасць забойстваў, калі прымяняць смяротнае пакаранне, толькі павышаецца як мінімум на тую колькасць людзей, якіх забілі па рашэнню суда.

Можа таму існая ўлада адмаўляе ў рэгістрацыі такім праваабарончым аб'яднанням як „Наша вясна", каб тыя не данеслі да грамадства іншы ад праўладнага погляд і на смяротнае пакаранне, і на іншыя аспекты жыцця беларускага грамадства.

І таму найбольшую адказнасць за існаванне смяротнага пакарання нясе на сабе ўлада. І за тое, што выхоўвае так сваіх грамадзян, і за тое, што адрывае ад развіцця еўрапейскіх каштоўнасцей і поглядаў на цывілізаванае разуменне справядлівасці той народ, які ганарыцца, што з'яўляецца цэнтрам Еўропы.

Віктар САЗОНАЎ

Свята дзяцей і мастацтва

Адчыніліся адкрытыя дзверы маляўнічага будынка Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку (вул. Модлінская, 2) 1 чэрвеня — у Міжнародны дзень дзіцяці не толькі перад дзяцьмі. Галоўным госцем быў Віктар Швед са сваёй новай — чатырнаццатай кнігай — „Смяшынкамі", якому пайшоў ужо 85 год, пра якога вядучая прамоцыю Аліна Ваўранюк сказала, што ён для нас ніколі не быў і не будзе старым. Выданне гэтай кніжкі вершаў для дзяцей фінансава падтрымаў якраз Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве РБ. Віктар Швед, вядомы з больш за тысячы аўтарскіх сустрэч, зноўку не паўтарыўся, і знаёмства з ягоным жыццём і творчасцю працягнулася вельмі хутка і цікава. Не толькі аўтар знаёміў сабраных рознага ўзросту са сваімі ўлюбёнымі вершамі, якія ён лічыць самымі лепшымі. Вучні Пачатковай школы № 4 і Гімназіі № 7 падрыхтавалі міні-спектакль са сваімі ўлюбёнымі шведаўскімі вершамі і запрапанавалі іх у выглядзе лялечнага тэатра. Сярод гасцей былі і маладзенькія мінскія мастакі, працы якіх паказваліся ў гэты дзень на выставе „Беларусь вачыма дзяцей" — чатырнаццацігадовыя Маша Банькова (родам з падвіцебскай вёскі) і Андрэй Рулькевіч, з якімі прыехалі іх выкладчыкі Ірына і Ігар Марачкіны. Паказаны былі таксама працы Алёны Ігнаццевай, Каці Свяцовай, Яні Несцяровіч, Фёдара Зелянкоўскага, Эдуарда Арзуманяна, Вікі Наруты, Рэнаты Лазарчык, Анны Мілашэўскай, Крысціны Калеснікавай, Лёні Бяляева, Тані Захарэвіч, Ліны Філіповіч, Аляксандры Бацішчавай, Іллі Сукневіча, Яўгена Чыстага і Мікіты Мельнікава. Можна спадзявацца, што іхнія прозвішчы стануць вядомымі не менш ад імён іхніх папярэднікаў і настаўнікаў.

Выстава складаецца з творчых работ навучэнцаў Дзяржаўнай установы адукацыі „Гімназіі-каледжа мастацтваў імя В. Ахрэмчыка", якая больш за сорак гадоў існуе ў Мінску, дзе заняткі вядуцца на беларускай мове. Ідэя стварэння школы мастацтваў для адораных дзяцей з усёй Беларусі належыць выдатнаму дзеячу беларускай культуры, народнаму артысту Беларусі Рыгору Шырму. Было вырашана адкрыць музычнае і мастацкае аддзяленні, дзе таленавітыя дзеці, як гарадскія, так і вясковыя, будуць навучацца і жыць у інтэрнаце. Дзяржава стварыла ўнікальныя ўмовы для станаўлення юных мастакоў і музыкаў. Пад кіраўніцтвам выдатных педагогаў-прафесіяналаў дзеці спасцігаюць таямніцы мастацкай творчасці. Навучэнцы атрымліваюць прафесійныя навыкі па малюнку, жывапісе, скульптуры, кампазіцыі, займаюцца дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, вывучаюць гісторыю сусветнага мастацтва. У час вучобы навучэнцы прымаюць актыўны ўдзел у розных рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Выпускнікі паступаюць вучыцца ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў і іншыя навучальныя ўстановы. Сярод выпускнікоў Гімназіі-каледжа нямала славутых мастакоў, якіх ведаюць у розных кутках свету. Гэта вядомыя жывапісцы Фелікс Янушкевіч, Віктар Альшэўскі, Уладзімір Крываблоцкі, графікі Уладзімір Вішнеўскі, Уладзімір Савіч.

— Гэты каледж — мая чацвёртая школа, — прызнаецца Андрэй Рулькевіч, выдатны талент таксама і па сціслых навуках. І карціны ягоныя спелыя, дасканалыя па тэхніцы і думцы. — Перавялі мяне сюды з апошняй маёй школы нашы выкладчыкі мастацтва, прыкмеціўшы мой талент. Мяне цягне таксама і матэматыка, і біялогія. У нас тут столькі заняткаў па мастацтве, што мне аж замала агульнаадукацыйных! Не ведаю які будзе напрамак майго прафесійнага жыцця, але, мабыць, выбяру, усё ж, акадэмію мастацтваў. Ды і з фотаапаратам бегаю...

Былі ўжо прапановы з боку ўлад, каб беларускамоўны прафесійны мастацкі каледж абярнуць у звычайную агульнаадукацыйную школу, з пашыранай колькасцю ўрокаў па мастацтве, але паколькі абявязвае тут і раёнізацыя (частка вучэльні гэта сярэдняя школа для звычайнай мінскай моладзі з гэтай ваколіцы), перавесці яе на рускую мову выкладання. Ёсць праблемы і з рамонтам, і з інтэрнатам. Звычайная справа ў час агульнага крызісу. Калі б вучэльня перастала быць кузняй незвычайных талентаў з усёй Беларусі, прытым выхаваных у беларускім, патрыятычным духу, была б гэта вялікая страта для ўсёй культуры.

Міра ЛУКША

Вачыма еўрапейца

Падвядзенне вынікаў

І выбралі мы новых еўрадэпутатаў. Мы, тут у Польшчы і ў дваццаці шасці іншых еўрапейскіх краінах. Калі мы аддавалі ў друк гэты нумар „Нівы", невядома было яшчэ, хто з падляшскіх кандыдатаў апынецца ў Еўрапарламенце. Я прабаваў яшчэ да закрыцця нашага тыднёвіка сам вылічыць, хто з кандыдатаў засядзе ў гэтых шаноўных лавах, але аказалася гэта быць немагчымым. Гэты рахунак не з'яўляецца простым тлумачэннем выбарчага парога ці яўкі выбаршчыкаў. Адна пані з беластоцкай дэлегатуры Краёвага выбарчага бюро не ўмела таксама прадбачыць колькі мандатаў, у залежнасці напрыклад ад яўкі выбаршчыкаў у галасаванні, трапіць на нашу акругу, значыць на спалучаныя падляшскую і вармінска-мазурскую. На чатыры дні да выбарчай нядзелі я пачуў ад яе:

— Гэта вельмі складаны перападлік. Прысутнасць у нашай акрузе не толькі залежыць ад прысутнасці ў іншых рэгіёнах і не толькі ад галасоў, якія будуць аддадзены на паасобныя камітэты ці кандыдатаў. Выбараў у Еўрапарламент не ўдасца параўнаць да польскіх парламенцкіх ці самаўрадавых выбараў.

Ну, што зробіш. Мабыць, калі чытаеце гэтую „Ніву", самі ўжо ведаеце, якая была канчатковая яўка і хто ўвайшоў у ЕП з нашай акругі.

Рашыў я тады абагуліць (вядома, павярхоўна) зробленае Еўрапарламентам у мінулым скліканні. Самымі цікавымі здаліся мне гэтыя поспехі, што непасрэдна паўплывалі на жыццё грамадзян-спажыўцоў. Так вось, дзякуючы еўрапейскім еўрадэпутатам маем: таннейшыя стаўкі роўмінгавых аплат у еўрапейскіх аператараў мабільнай сувязі. Інфармацыя аб цэнах авіябілетаў, аб'яўленая ў рэкламах або публікаваная на інтэрнэт-старонках прадаўца, мусіць змяшчаць усе кошты і дадатковыя аплаты. Рэкламы ў тэлебачаннях не могуць перасягаць дванаццаці хвілін на гадзіну. Урэшце ўведзена была забарона прымяняць пры вырабе цацак небяспечныя і канцэрагенныя хімічныя рэчывы. З іншых „цікавінак", еўрадэпутаты рашылі, што ад будучага года пасажырскія перавозы на міжнародных шляхах будуць канкурэнтныя, а пасажыры здабудуць новае права на кампенсацыю за спазненне цягнікоў, маюць быць чысцейшыя пляжы і воды ў курортах, рэках і азёрах, нельга прымяняць ртуць у градусніках, часовыя працаўнікі набудуць такія самыя правы як працаўнікі занятыя пастаянна. Гэта толькі незвычайна малы адрэзак дзеянняў ЕП апошняга склікання ў карысць гэтак званага сярэдняга грамадзяніна.

Парламент займаўся таксама пытаннямі, так сказаць, важкага значэння; быў хоць бы актыўны на міжнароднай арэне. Напрыклад, прыняў рэзалюцыю, згодна з якой ААН у палове снежня 2007 г. абвясціла ўсеагульны мемарандум на смяротнае пакаранне. Важна было гэта, м.інш., у кантэксце Беларусі. Дарэчы, у адносінах да гэтай краіны і захоўвання ў ёй дэмакратычных прынцыпаў ЕП выдаў шэраг рэзалюцый.

Пераглядаючы дасягненні Еўрапейскага парламента за апошнія 5 гадоў, аказваецца аднак, што дэпутаты гэтай палаты шмат робяць, а не толькі — як некаторыя кажуць — бяруць аграмадныя грошы. ЕП разам з іншымі еўрасаюзнымі структурамі, такімі як Еўрапейская камісія, з'яўляецца не толькі бюракратызаванай установай, але стае перад выклікамі ў абарону сваіх грамадзян, грамадзян Еўропы народаў. Тут варта прыгадаць словы старшыні ЕК Хазэ Мануэля Барозу:

— Я асабліва ганаруся тым, як павялі мы сябе перад фінансавым і гаспадарчым крызісам, нашай амбітнай праграмай супрацьдзеяння зменам клімату ды стварэннем сапраўднай еўрапейскай энергетычнай палітыкі.

Падстаў для гонару трэба было б жадаць таксама новаабраным еўрадэпутатам.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Набліжаецца лес

У Літвінавічах крама была побач святліцы

З чыгуначнага вакзала ў Нурцы-Станцыі кіруюся ў напрамку вайсковага гарадка. Па дарозе заўважаю браму каталіцкіх могілак, а за брамай — прыроду. Не відаць за брамай магілак, аднак значна далей заўважаю невялікія каляровыя тэрыкончыкі і ўзнікае ў мяне цікавасць, ці гэта не нейкая эндэмічная форма пахавальных насыпаў, калярова аздобленых; бо ж на могілках магілы павінны прысутнічаць. Заходжу на могілкі, іду пратаптанай там сцежкай і расчароўваюся: тыя каляровыя тэрыконы, напамінаючыя прыбраныя квеццем магілы, аказваюцца звалкамі каляровых лампадак.

Сцежкай ідзе жанчына, пытаю яе, як трапіць у вайсковы гарадок. Яна інфармуе мяне, але стараецца неяк абысці мяне шырокім абыходам, раптам заварочваецца назад і хуткім крокам стараецца аддаліцца ад мяне. Задзівіла гэта мяне, бо ж яшчэ дагэтуль не здарылася так, каб нехта ад мяне ўцякаў. Ну, але ж гэта могілкі, да таго ж такія, якія задзівілі нават мяне. Праўда, некраполія з акуратнымі намагільнікамі неўзабаве паказалася ў супрацьлеглым акрайку абшырна абгароджанай прасторы для фінальных людзям месц. Але чаму жанчына затрывожылася? Хто ведае, мо я нагадаў ёй некага з ейных знаёмых, што спачылі ў тым месцы і якога не прабілі асінавым калом. Мо ёй падалося, што ўжо гэта пачынаецца тая падзея, якой спадзяюцца нашы веруючыя людзі, што наступае судны дзень, апакаліпсіс...

Заходжу ў вайсковы гарадок з бадай чатырох жылых блокаў. Даволі бязлюдна ў ім, чуваць гук мотакасілкі. Гандлёвае памяшканне пустуе, насупраць яго пусты таксама будынак гарнізоннага клуба. Крыху далей зарастаючы травой стадыён. Два гады таму размаўляў я з тадышняй дырэктарам Гміннага асяродка культуры ў Нурцы-Станцыі і яна гаварыла, што гміна хадайнічае за атрыманне гарнізоннага клуба ад войска. Нядаўна наша Міністэрства нацыянальнай абароны рашыла неадплатна перадаць самаўрадам некаторыя з пустуючых аб'ектаў былых вайсковых часцей. Магчыма, што і Нурэц атрымае гэтым шляхам патрэбны для культурных мерапрыемстваў будынак з глядзельнай залай.

Выходжу на лясную дарогу і інтуітыўна кіруюся ў бок асфальтоўкі, што выходзіць з Нурца ва ўсходнім напрамку, у напрамку галоўнай гміннай тэрыторыі. Акурат спатыкаю дрывасекаў, якія інфармуюць мяне пра выбар правільнага шляху. Выходжу на асфальтоўку каля крамы, побач якой памочнік прадаўца расстаўляе крэслы ў піўным агародчыку. На пытанне, што было ў супрацьлеглым арыгінальным будынку з чырвонай цэглы, адказвае, што раней была там кафлярня.

Вёска Аўгустынка з'яўляецца па сутнасці наборам хутароў, дзе некаторыя з іх распаложаны недалёка шашы. Прэзентуюцца яны па-рознаму, аднак нейкіх палацаў там не відаць. Ад аднаго панадворка разыходзіцца рэзкі пах свіной гнаёўкі, відаць адзінокіх кароў, побач аднаго панадворка загарада з некалькімі коньмі. Ёсць і цікава прыаздобленыя хаты.

У лесе, што між Аўгустынкай і Сяміхочамі, спыняецца побач мяне лясніх з Нурэцкага надлясніцтва. Заводзім ветлівую гутарку, мой субяседнік інфармуе мяне пра выдатнасці наваколля. Даведваюся, што ў Сямёнах, у Гродзіскай гміне, з якой ён родам, ёсць выдатны парк, дзе пад восемдзесят масцітых дубоў — гэта больш чым у Старой Белавежы. І некаторыя з іх у тры абхваты; адзін такі дуб ёсць і ў недалёкім запаведніку ў Сакуллі. Да таго ж у найбліжэйшым наваколлі ёсць цікавыя археалагічныя аб'екты, напрыклад, „крэпасць" каля Клюковіч, антрапагенны рэльеф між Барысаўшчынай і Аўгустынкай ці „глыбак" за Вулькай-Нурэцкай з боку Пянькоў.

У краявідзе перад Сяміхочамі заўважаю навінку: рэкультывацыю ранейшага лясного ўчастка! Шмат тут пачарнелых пянькоў дзесяці-дваццацігадовых соснаў, ссечаных год-два таму, шмат ліставога хмызу; і па ўсім гэтым успеў ужо праехацца культыватар — „еўрасаюзная" зямля больш каштоўная чым самасей. Крыху далей стаў, якога вартуюць два пудзілы. Калісь такіх „вартавых" ставілі на палях, у садах і ў агародах каб страшылі птушак. Цяпер, калі многія палі зараслі лесам, птушкі, мабыць, сталі шукаць спажыву ў вадаёмах і цяпер адтуль іх трэба адпуджваць...

Пры расхадных дарогах у заходнім канцы Сяміхоч заўважаю рупліва каліся апекаваны панадворак, абсаджаны ад вуліцы стройнымі клёнамі. Цяпер той панадворак паступова зарастае саснінай. Пазней даведаюся, што ў ягоных колішніх руплівых гаспадароў не было нашчадкаў...

Ды гэта не адзін зарастаючы панадворак у Сяміхочах. На ўчастку ўпрытык з тамашнім касцёлам таксама расце прыстойненькі сасновы лясок. І на панадворку з другога боку вуліцы бярозы з соснамі...

Будынак пажарнага дэпо ў Сяміхочах, у якім і вясковая святліца, выглядае даволі прыстойна; у ім новыя дзверы, абноўленыя вокны — гэтае абнаўленне адбылося ў мінулым годзе. Але святліца, як сказаў мне жыхар недалёкай хаты, скарыстоўваецца ў прынцыпе толькі для ладжання трызнаў, бо ў Сяміхочах асталіся па сутнасці ўжо толькі пажылыя людзі... Перад дэпо пад адмысловай паветкай музейны экспанат — колішняя пажарная помпа...

У Сяміхочах працуе яшчэ пачатковая школа. З Сяміхоч дзяцей мала, вучацца там дзеці з суседніх мясцовасцей — Клюковіч, Вулькі-Нурэцкай...

Падаюся на поўдзень, у бок Стоўбцаў. З гэтага боку Сяміхоч шмат маладых лясоў, сасновых і бярозавых. Мабыць неўзабаве гэтыя лясы схаваюць ад людскіх вачэй і арыгінальны тамашні курган, у кшталце двух'яруснага торта. І паўночныя акраіны Стоўбцаў складаюцца па сутнасці з раскіданых хутароў, спалучаных грунтавымі дарогамі, з якіх складана было б вылучыць галоўную — нейкую вуліцу. І грунт тут слабы, неспрыяльны для сельскай гаспадаркі, асабліва ў наш час, бо патрабуе шмат мінеральных угнаенняў, якія цяпер у цане. Не мяняе гэтага вобразу і ўзараная паласа аблагу, бо гэта, мабыць, кан'юнктурны парыў у час земляробчых даплат. Наш цяперашні сельскагаспадарчы строй крыху здаецца падлягаць Дарвінавым прынцыпам — у барацьбе за сельскагаспадарчае выкарыстанне выйгравае больш класная зямля, як у прыродзе мацнейшыя арганізмы. І гэта здаецца выглядаць па-капіталістычнаму рацыянальна — ад зямельных участкаў паводле „здольнасцей"; рыхтык так, як ад людзей меў патрабаваць папяровы камунізм.

Гэтая слабая зямля ў Стоўбцах вырашыла і пра лёс вёскі. Некаторыя хаты яшчэ трымаюцца, але вось з боку Літвінавіч выгляд іх даволі сумны; многія з іх пакінуты волі лёсу і падаюць пад напорыстасцю прыроды. Не відаць тут земляробчай дзейнасці, ёсць яшчэ аблагі, мабыць, гаспадарылі на іх найбольш адданыя апрацоўцы зямлі сяляне, адпраўляючы сваіх нашчадкаў у больш спрыяльны свет. Навокал расце маладая змена суседняму старому лесу, які магутныя трэйлеры вывозяць у той свет, у які падаліся стаўбцоўскія ўраджэнцы.

У Літвінавічах задзівіў мяне пейзажны нацюрморт. На пляцы побач тамашняй невялічкай святліцы пабачыў я самотны прылавак пасярэдзіне цэментнай падлогі. Даведаўся я, што некалькі дзён раней нехта купіў будынак былой вясковай крамы, разабраў і забраў яго. Крама стала непатрэбнай, бо ў суседніх Клюковічах крамы дзве. Таксама і згаданая святліца ў Літвінавічах выглядае не надта патрэбнай, бо ніхто не пратоптвае да яе слядоў, а пляц вакол яе бесперашкодна зарастае дзьмухаўцамі.

Клюковічы лічыліся калісь найважнейшай вёскай у наваколлі. Калі пасля другой сусветнай вайны была паблізу ўстаноўлена дзяржаўная граніца, Клюковічы сталі гмінным цэнтрам. У склад гэтай гміны ўвайшлі тэрыторыі былога Брэсцкага павета Палескага ваяводства, якія пры санацыі падлягалі гмінам у Высока-Літоўску, Вярховічах і Воўчыне (гэта той Воўчын, дзе 17 студзеня 1732 года нарадзіўся апошні польскі кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі). Клюковіцкая гміна ў такім агульным кшталце праіснавала да 1954 года, да часу адміністрацыйнай рэформы, якая гміны скасавала. У межах гэтай гміны апынуліся такія м.інш. мясцовасці як Полаўцы (дзе да 1933 таксама была гміна, пазней частка яе была далучана да Высокаўскай гміны, а частка да Вярховіцкай), Беражышча, Зубачы, Аўгустынка, Такары (заходняя частка вёскі, якая апынулася ў межах Польшчы) ды Катэрка, якая да вайны была ў складзе Воўчынскай гміны; гміна налічвала тады звыш васьмі з паловай тысяч насельніцтва. Калі ў пачатку 1950-х гадоў, у рамках чарговай адміністрацыйнай рэформы, з Бельскага павета былі вылучаны Гайнаўскі і Сямятыцкі паветы, ад Клюковіцкай гміны былі адлучаны Зубачы, Полаўцы, Беражышча, Такары і Вілінава, а далучаны Вэрпаль. У час чарговай адміністрацыйнай рэформы ў палове 1970-х гадоў гміна ў Клюковічах не была адноўлена, толькі ўключана ў склад Нурэцкай гміны.

У Клюковічах раней працавала геэсаўская база; ад яе асталіся пустуючыя будынкі ў пачатку вёскі з боку Літвінавіч. У цэнтры Клюковіч, дзе вясковую вуліцу перасякае дарога з Такароў у Зубачы, працуюць пакуль згаданыя раней дзве крамы. Будынак былой гміннай установы служыў нейкі час вясковым асяродкам здароўя, цяпер ён выконвае ролю жылога дома. Ёсць і будынак пажарнага дэпо са святлічным памяшканнем, але ролю культурнай установы выконвае двухпавярховы будынак былой школы.

У школьным будынку месціцца бібліятэчны пункт, які раз у тыдзень адкрывае бібліятэкарка з гміннага Нурца-Станцыі. Найгорш зімою, бо вялікі будынак пастаянна не абаграваецца. Усе кніжкі і часопісы на польскай мове, няма нават нічога англамоўнага... Чытачы наведваюць бібліятэчны пункт, найбольш маладыя, але прыходзяць і старэйшыя. У школьным будынку адбываюцца таксама розныя выбары, ладзяцца тут таксама вясковыя сходы.

Пра паходжанне назвы вёскі Пішчатка лёгка здагадацца, бо вакол яе *пісок*. Вялікага гаспадарання ў ёй не відаць. У суседняй Тымянцы яшчэ пару гадоў таму працавала крама, зараз яна закрыта і след па пакупніках каля яе ўжо прастыў.

Школьны будынак у Клюковічах

Пікнік з мундзірам

Як штогод 1 чэрвеня адзначаўся Міжнародны дзень дзіцяці. З гэтай нагоды арганізаваліся імпрэзы ў школах і садках. Вучні трэціх класаў Пачатковай школы ў Чаромсе, напрыклад, са сваімі выхавацельніцамі арганізавалі веласіпедную экскурсію над Рэпчыц-

Чэмпіён Славамір Вошчанка прэзентуе дзеткам „Агота"

кі вадаём і правялі вольны час пры вогнішчы і пячэнні каўбасак, а дырэкцыя Комплексу школ № 2 у Гайнаўцы арганізавала „Пікнік з мундзірам". У мерапрыемстве ўдзельнічалі дзеткі, іх бацькі ды прадстаўнікі мундзірных служб — паліцыянты, пагранічнікі і пажарнікі. Дзеткі мелі нагоду пазнаёміцца з сучаснай тэхнікай і дрэсіроўкай паліцэйскага сабакі „Агота". Варта адзначыць, што праваднік сабакі штабны сяржант Славамір Вошчанка стаў сёлетнім чэмпіёнам Польшчы на спаборніцтвах сабакаводаў у Сулковіцах. Малечы вялікае зацікаўленне праяўлялі скафандрамі, якімі карыстаюцца пажарнікі, напрыклад, у час ліквідацыі хімічнай аварыі ці пры абясшкоджванні пчол. Імпрэза закончылася супольным пікнікам дзетак, бацькоў і функцыянераў мундзірных служб пры ражне.

(УС)

Фота: Гайнаўскі цэнтр інфармацыі Павятовай камендатуры паліцыі

Партрэт маёй маці

Гмінны асяродак культуры ў Дубінах з нагоды Дня маці падрыхтаваў вельмі прыемнае мерапрыемства. Дзеці выступалі на сцэне, дэкламавалі вершы, спявалі. Найбольш аднак уражанняў даставіў усім конкурс п.з.

„Партрэт маёй маці". Яшчэ перад святам дзеці выконвалі малюнак найдаражэйшай ім асобы. Задачай для мам было распазнаць сябе на партрэце. Не абышлося пры гэтым без смеху і радасці. Дзеці павіншавалі сваіх мам і ўручылі малюнкі ў выглядзе веераў, якія раней уласнаручна выканалі на занятках у ГАКу. Урачыстасць завяршылася салодкім пачастункам. Мамы былі вельмі задаволены сваімі дзяцьмі і добра падрыхтаваным мерапрыемствам.

Пётр БАЙКО
Фота Лілі ФАБІСЯК

Ці бедным вецер у вочы?

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Такое выказванне паяўлялася, паяўляецца і пэўна будзе паяўляцца, хаця яго філасофскі характар дазваляе на розную інтэрпрэтацыю з'явы беднасці. На працягу апошніх дваццаці гадоў у сельскай гаспадарцы многа памянялася, але частка сялян надалей трымаецца сваёй бацькаўшчыны, абрабляе палі сваіх родзічаў, велічынёй пад 10 гетараў, гадуе па 4-6 кароў, па некалькі цялят і свіней, і цяжка ім сабраць грошы, каб выслаць сваіх дзяцей у горад па вышэйшую адукацыю. Непасрэдныя даплаты да 10 гектараў апрацоўваных палёў, нават з дадаткам да гаспадарання ў цяжкіх умовах, гэта прыблізна 500-600 злотых у месяц, а колькі ж ёсць у нас земляробў, што абрабляюць па 5-6 гектараў поля. Зараз Малочны кааператыў у Гайнаўцы плаціць гаспадарам, якія трымаюць па некалькі кароў, прыблізна па 50-60 грошаў за літр малака (залежна ад колькасці бялку; у выпадку фермераў, якія прадаюць многа малака, прапануецца ім вышэйшая цана, што мае спрычыніцца да росту вытворчасці малака). Такая цана ў некаторых выпадках нават можа не гарантаваць вяртання коштаў прадукцыі (калі, напрыклад, трэба дакупіць даражэйшае збожжа, бо сваё не ўрадзіла).

— Нават літр негазаванай вады каштуе больш злотага, а за малако плацяць удвая менш. Каб выпрадукаваць малако, трэба многа напрацавацца, — заяўляе Андрэй Ціханюк з Чыжоў.

На цэны сельскагаспадарчых прадуктаў нават і зараз, ва ўмовах рынкавай эканомікі, уздзейнічаюць як наш урад (напрыклад, праводзячы скупку ў запас), так і еўрасаюзныя структуры, у якіх глабальна вырашаюцца сельскагаспадарчыя справы Еўрасаюза. Гэта да іх найбольш прэтэнзій кіруюць нашы гаспадары. Аднак якраз аб велічыні цаны скупкі малака ў паасобных малочных кааператывах вырашаюць улады гэтых жа кааператываў (разумеецца, што ў пэўных межах, каб пасля не абанкруціцца), якіх у многіх выпадках выбіраюць самі сяляне.

Якая будучыня звычайных гаспадароў?

У гэтым годзе земляробам, якія атрымліваюць непасрэдныя даплаты да апрацоўваных палёў і фермерам, якія выступаюць за большую еўрасаюзную дапамогу, сталі раздаваць кніжачкі „Патрабаванні ўзаемнай згоднасці". У іх падрабязна расказваецца аб еўрасаюзных патрабаваннях у адносінах да атрымальнікаў грашовай дапамогі з еўрасаюзнага бюджэту. Гаворыцца там, між іншым, аб патрэбе захавання добрай сельскагаспадарчай культуры, згоднай з аховай асяроддзя, якой павінны трымацца нашы гаспадары, каб як найменш спрычыніцца да дэградацыі зямлі і як найменш пашкодзіць прыродзе. З гэтай кніжачкі гаспадары могуць даведацца як павінны вырошчваць збожжа і іншую расліннасць і колькі максімальна даваць мінеральнага ўгнаення, каб пазбегнуць грашовых санкцый. Ёсць там таксама многа іншых указанняў на-

Чыжоўскі солтыс і заадно радны Андрэй Ціханюк

конт аховы асяроддзя, будовы кароўнікаў, свінарнікаў, складоў для збожжа, сельскагаспадарчых прадуктаў, мінеральнага ўгнаення, сродкаў аховы расліннасці ці паліва. Дагэтуль кантралёры з Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі асаблівую ўвагу звярталі на пасяўныя плошчы, правяралі найчасцей іх велічыню і спраўджалі, ці на месцы задэкларавана ў дакументах збожжа не знаходзяцца аблагі, або не растуць кусты, што маглі таксама загадзя заўважыць на здымках, зробленых з самалётаў ці спадарожнікаў. Нават у адным бюро АРіМСГ на Беласточчыне запыталі чалавека, чаму ён не дэкларуе да даплат поўнай дзялянкі абсеянай збожжам, паколькі каменне і аблог знаходзяцца на суседняй дзялянцы, што відаць на здымку. Нашы гаспадары звыкліся ўжо з кантролямі на палях і пачалі апасацца, што кантралёры могуць спраўджаць, ці гаспадары перахоўваюць мінеральнае ўгнаенне або сродкі аховы раслін у асобных месцах, на бетанаваных, ці інакш забяспечаных перад пераніканнем шкодных прадуктаў у зямлю, плітах. Вядома, што толькі частка нашых гаспадароў выдзеліла такія месцы.

Аднак у звычайных сялян найбольш эмоцый выклікае будова ў аборах плітаў і ўмяшчальнікаў на гнаявую жыжку, бо рэалізацыя такіх інвестыцый патрабуе выдаткавання большых сродкаў. Дагэтуль практычна толькі кантралёры санэпідэмстанцыі і ветэрынары заходзілі ў хлявы, але гэта можа памяняцца, паколькі прадбачваецца, што да лета гэтага года будзе ўпарадкавана агульнапольская сістэма рэгістрацыі і перамяшчэння свіней (раней на практыцы яна была недастатковай) і можа пачацца больш дакладнае кантраляванне гадоўлі. Прадугледжваецца нават, што ў выпадку, калі кантралёры знойдуць хібы ў гадоўлі, могуць абмежаваць непасрэдныя даплаты да апрацоўваных палёў. Ёсць аднак у земляробаў надзея, што ў час кантроляў будзе спраўджацца ў галоўным згоднасць колькасці кароў ці свіней, якія знаходзяцца ў хлявах, з задэкларанай колькасцю ў дакументах. Многія нашы гаспадары дэкларуюць, што калі кантралёры стануць чапляцца звычайных хлявоў і станунць патрабаваць будаваць умяшчальнікі для гнаявой жыжкі, то яны зракуцца гадоўлі кароў.

Каб павысілі цэны

Чыжы аддаюць перавагу вырошчванню збожжа. Ураджай і цана збожжа павінны вырашаць аб дастатку або беднасці гаспадароў.

— У нас ёсць крыху малодшых гаспадароў, але дапамагаюць ім яшчэ бацькі, бо без іх пенсій цяжка было б маладым гаспадарыць, — кажа чыжоўскі солтыс Андрэй Ціханюк. — Цана збожжа панізілася апошнім часам, а сродкі аховы расліннасці і мінеральнае ўгнаенне вельмі дарагія. Зараз цэнтнер самага таннага мінеральнага ўгнаення каштуе пад 250 злотых, а без яго не будзе добрага ўраджаю. На скупцы за тону харчовай пшаніцы плацяць па 500-530 злотых, а за тону фуражнай — па 450 злотых.

Да гэтага яшчэ трэба дабавіць падатак на дабаўленую вартасць (ПДВ), але трэба адначасна адняць скідку на горшыя каардынаты звычайнага збожжа ад таго, на падставе якога дэкларуецца сярэдняя цана на скупках. Найчасцей нашы гаспадары прадаюць пшаніцу як фуражную, бо малавата ў ёй бялку і атрымаецца прыблізная цана да той, якую ў даны момант прадыктаваў мне спадар Ціханюк.

— У нас ёсць збожжа на продаж, але покі слабавата плацяць за яго. Аднак маю надзею, што пасля жніва павысіцца цана збожжа. Хаця зараз прыбытак ад прадукцыі збожжа вельмі нізкі, дык трэба многа даглядаць за яго вырошчваннем, каб атрымаць прыстойны ўраджай, — гаворыць Ян Адамчук з Чыжоў, пенсіянер, які дапамагае сынам гаспадарыць.

— У Чыжах толькі адзін гаспадар гадуе каля 10 кароў, а ўсе іншыя меншую колькасць. Ніхто ў нас не схоча будаваць плітаў і ўмяшчальнікаў на гной, а хутчэй за ўсё нашы гаспадары зракуцца гадоўлі. У нашай гміне ёсць двух буйных жывёлаводаў у Кленіках, але ў іх ёсць добрыя ўмовы для гадоўлі, — гаворыць Андрэй Ціханюк, які пасля размоў з сямейнікамі таксама паменшаў статак кароў. — Калі б плацілі за літр малака па 2 злоты, гаспадары большалі б яго прадукцыю і мадэрнізавалі б хлявы.

Чаму варта паступаць у Гайнаўскі белліцэй?

Памалу набліжаецца заканчэнне чарговага 2008/2009 навучальнага года. Для вучняў гэта час падвядзення вынікаў, аналізу сваіх поспехаў і няўдач, час хваляванняў.

Вучні першага класа з гуманітарным ухілам Гайнаўскага беларускага ліцэя падзяліліся сваімі рэфлексіямі наконт тэмы „Як прайшоў мне першы год вучобы ў белліцэі?". Вось некаторыя выказванні.

(як)

* * *

Калі я паступала ў Гайнаўскі белліцэй, я была поўная надзеі, што тут буду мець магчымасць развівацца ў галіне рускай мовы. І не памылілася ... Я ўдзельнічала ў алімпіядзе па гэтым прадмеце.

Усе мае блізкія ведаюць як я люблю гутарыць і гэта на кожную тэму. Белліцэй стварыў мне магчымасць пераказаць пазітыўную энергію, цераз гутарку, іншым людзям. Дзякуючы гэтай школе, я магла забаўляць другіх, уводзіць у іх жыццё хаця на хвіліну іскру радасці, забыцця пра штодзённыя цяжкасці.

Беларуская мова ў маім жыцці таксама адыгрывае вельмі важную ролю. Яна была і ёсць мне роднай мовай. Гэта мова, якая спадарожнічае мне ад дзяцінства. Калісьці матуля мне гаварыла, што гэтую мову нам трэба зберагаць ад забыцця і шанаваць яе, бо гэта ж цудоўная мова нашых продкаў. Мне вельмі цёпла на сэрцы, калі я чую, што людзі яшчэ адчуваюць да беларускага слова прыхільнасць.

Кожны малады чалавек павінен разважыць паступленне ў белліцэй — калі не па сваім вырашэнні, дык па просьбе бацькоў. Сапраўды варта!

Эвеліна Прабуцкая

* * *

У 2008 годзе я пачала навуку ў Гайнаўскім белліцэі. На пачатку школьнага года я пазнаёмілася са сваімі новымі сяброўкамі і настаўнікамі. Першыя дні былі цяжкія і я неахвотна ўставала раніцай, але потым я прывучылася. У палавіне месяца пачалася вучоба, кантрольныя працы, але таксама і экскурсіі, напрыклад, у Беласток. На паўгоддзе настаўнікі выставілі нам ацэнкі. Не ўсе былі добрыя. З таго часу я больш старалася прыкладацца да ўрокаў. Потым былі зімовыя канікулы і, калі мы вярнуліся ў школу, кожны з нас дзяліўся сваімі ўражаннямі. У маі змянілі нам нашу выхавацельніцу (яна пайшла ў водпуск) на настаўніка, які вучыць польскай мове.

Цяпер, калі я гэтае пішу, з усмешкай на твары спаглядаю ў мінулы час. Не шкадую, што я выбрала гэтую школу. Бягучы школьны год я буду па-

мятаць да канца жыцця, але цяпер чакаю летніх канікулаў.

Агнешка Матысюк

* * *

Ужо чэрвень, а я нават не прыкмеціў калі мінуў увесь навучальны год. Калі я ішоў у наш белліцэй, знаёмыя мне былі настаўнікі, класы і большасць сяброў, таму што пры ліцэі існуе гімназія, у якой я вучыўся тры гады. Дык мяне вельмі моцна цікавіла, якія новыя дзяўчаты будуць у нашым першым „ц". Ніхто не ведаў, што нас дакладна чакае ў ліцэі. Я ведаў, якія настаўнікі будуць нас вучыць, але не ведаў як яны нас патрактуюць. Моладзь у ліцэі амаль ужо дарослая і не можа бяздумна „валяць дурака". Першае паўгоддзе мінула хутка, я стаў лаўрэатам рэлігійнай алімпіяды і прымаў удзел у дэкламатарскім конкурсе. Гэты год мінуў мне вельмі працавіта на пазашкольнай і школьнай

ніве. Настаўнікі маюць вельмі добрыя адносіны да вучняў і шануюць іх шматлікія заняткі. У гэтым годзе я пазнёміўся з многімі хлопцамі і дзяўчатамі. Лічу, што быў гэта для мяне добры год, у якім я стараўся быць заўсёды з усмешкай на твары.

Пётр Давідзюк

* * *

Калі я прыйшла першы раз у белліцэй, была вельмі ўсхваляваная, таму што я мала каго ведала. Я баялася толькі таго, каб было з кім сесці за парту. Верасень мінуў хутка. Я знаёмілася з новымі сяброўкамі. Настаўнікаў ведала, таму што я тут раней вучылася ў гімназіі. Ай, як цяжка ў ліцэі, часта восем урокаў удзень, трэба многа чытаць. Наша выхавацелька аднак намі захапляецца, кажа, што мы цудоўны клас. Арганізуем экскурсіі ў тэатр. Пад канец першага паўгоддзя ўжо кожная дзяўчына знайшла сабе сяброўку, а Пётрэк-„Жубэр" і Яцэк таксама па-

сябравалі. У нашым гуманістычным класе няма ніякіх сварак, усе мілыя і сімпатычныя. Цяпер мы марым толькі аб канікулах...

Паўліна Лапінская

* * *

Добра памятаю дзень, калі я першы раз прыйшла ў гэтую школу. Я стала першакласніцай белліцэя. На пачатку я не была ўпэўнена, ці правільна выбрала профіль (біялагічна-хімічны) класа. Мой новы клас быў таксама перапа-

лоханы, як і я. Спачатку ніхто да сябе не адзываўся, а ў маім сэрцы гучала пытанне: „Што я тут раблю?" Выхавацель завёў нас у клас, назваў сябе і расказаў нам пра іншых настаўнікаў. Аднак я далей вельмі баялася.

У лістападзе я змяніла ўхіл класа і пачала вучыцца ў „гумане". У класе панавала прыемная атмасфера, мы на працягу гэтага года сапраўды палюбіліся.

Дабягае канца першы год маёй навукі ў белліцэі. Я магу сказаць, што я задаволена сваімі ацэнкамі. Цяпер я ўпэўнена, што белліцэй — гэта найлепшы шлях, які я магла выбраць. У гэтай школе я магу вучыцца маёй роднай беларускай мове. Яшчэ пяць гадоў таму я гаварыла, што я палячка, а мае бацькі — беларусы. Цяпер я ведаю, што я таксама па крыві — беларуска. Я ўжо ведаю, што не можна гаварыць, што я яблынька, але вырасла на грушы, таму што гэта немагчыма.

Анна Каўшук

З'езд беларусаў свету ў Мінску

У чацвер, 4 траўня кіраўніцтва МГА ЗБС „Бацькаўшчына" атрымала вуснае паведамленне з Мінгарвыканкама пра прадстаўленне памяшкання для правядзення V З'езда беларусаў свету. Згодна з ім, на 18-19 ліпеня 2009 г. для правядзення з'езда могуць быць прадстаўлены ў арэнду актавая зала Дома культуры Мінскага трактарнага завода або зала Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра (IBB).

У той жа дзень увечары было праведзена пасяджэнне Управы МГА ЗБС „Бацькаўшчына", на якім разам з інфармацыяй аб ходзе падрыхтоўкі да з'езда было агучана рашэнне Мінгарвыканкама. Прысутныя абмеркавалі магчымасці двух залаў і вызначылі прыярытэтным памяшканне Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра. Пры гэтым улічваўся і той факт, што МГА ЗБС „Бацькаўшчына" ўжо мае пасляховы досвед супрацоўніцтва з гэтай установай: менавіта там праходзіў папярэдні з'езд беларусаў свету. Зала ДК Мінскага трактарнага завода разглядаецца як запасны варыянт.

Нагадаем, што пачынаючы з лютага гэтага года МГА ЗБС „Бацькаўшчына" даслала запыты ў 22 адміністрацыі ўстаноў сталіцы, у тым ліку і Мінгарвыканкам, з просьбай прадставіць памяшканне для правядзення з'езда. Дваццаць з іх пад рознымі нагодамі адказалі адмовай, пасля чаго кіраўніцтва арганізацыі пачало перамовы з прадстаўнікамі беларускай дыяспары суседніх краін аб правядзенні з'езда ў замежжы, а таксама арганізавала адпаведную інфармацыйную кампанію ў прэсе.

Такім чынам, паведамляем дэлегатам і гасцям, што V З'езд беларусаў свету адбудзецца 18-19 ліпеня 2009 года ў Мінску.

Прэсавая служба МГА ЗБС „Бацькаўшчына"

Дарога плачу

Ад дарогі ў вёску Слабодка Нараўчанскай гміны адыходзіць дарога, якая пралягае каля Новай Лукі, праз Міхнаўку, каля Лешукоў і далей вядзе ў напрамку Нараўкі і Міхалова. На адрэзку гэтае дарогі між Слабодкай і Міхнаўкай (каля святліцы) няма асфальту, толькі жвіровы насціл. А яе стан такі, што людзі называюць яе „дарогай плачу". Так яна разбітая аўтатранспартам, размытая дажджамі, столькі на ёй калдобін, што ехаць па ёй проста немагчыма. А ў мясцовага насельніцтва няма іншага выхаду і штодзённа карыстаюцца ёю ўладальнікі легкавых машын і пасажыры аўтобусаў, які курсіруюць па ёй некалькі разоў у суткі. Пасажыры адчуваюць сябе так, быццам аўтобус ехаў па замёрзлай грудзе. Расказваюць, што адзін пенсіянер у час такога падарожжа згубіў у аўтобусе зубны пратэз!

Было б пажадана, каб па гэтай „качалцы" праехаліся нараўчанскія чыноўнікі разам з мясцовымі дэпутатамі, і пасля такой разведкі сказалі жыхарам, калі на гэтым адрэзку дарогі будзе пакладзены асфальт. А да гэтага часу гравейку неакладна папраўіць — падсыпаць жвіру, пусціць грэйдар і давесці „дарогу плачу" да належнага стану. Калі гмінныя ўлады абыякава паставяцца да гэтай праблемы, дык жыхары запатрабуюць кампенсацыі за зламаня рысоры аўтамашын і зубныя пратэзы.

Д. Д.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Певень і ліса ў дуэце!

— Інакш мы загінем пад смеццем! — Вера Масайла тлумачыць чаму ў сваёй пастаноўцы звярнулася ў бок экалогіі. Разам з дзеткамі паставіла яна агульнавядомую „Казку пра пеўніка і лісу". Гайнаўскія акцёры перавялі дзею ў наш час і змянілі заканчэнне. У народнай версіі хітрая лісіца з'ядае наіўнага пеўня. А ў іхняй — усё канчаецца інакш. Бо раней усе звяры хварэюць ад забруджанай вады, якую запаскудзілі дзеткі пакетамі з-пад чыпсаў і пластмасавымі бутэлькамі. На шчасце ёсць у гэтай пастаноўцы добрая бабуля. Яна ведае як выратаваць звяроў. Дзеля іх аздараўлення гатуе гарбату з лясных зёлак. Дзякуючы ёй у канцы добрыя і злыя звяры разам з сабой танчаць і спяваюць.

„Певень" і „Ліса" ў дуэце

Але не гэта ў пастаноўцы захапіла школьнікаў з Гайнаўкі. Спадабалася іх сцэнічная шчырасць. Без усякіх *фю-бздзю!* І песні, якія праспявалі „Певень" і „Ліса". У цэлым адчувалася цеплыня і сардэчнасць. Магчыма, што гэта ўплыў заангажаваных у гайнаўскі тэатр бабуль. (Пані Вера — пенсіянерка, у Гайнаўскім доме культуры з дзеткамі працуе валанцёркай). На першае месца, якое атрымалі, яны поўнасцю заслужылі!

Вядома, калі ў п'есе іграюць усе ахвотныя, ролі няроўныя.

У гэтым плане не падвялі адно гімназісткі з Нарвы. У гэты раз яны паказалі шырокавядомую „Пярэстую красулю" менш вядомага ўкраінскага аўтара А. Чужыніна.

— Цягам апошняга школьнага года мы паставілі адзінаццаць п'ес, — кажа апякунка Ніна Абрамюк.

Свае пастаноўкі найперш паказваюць яны жыхарам мястэчка, вёсак, часам выступаюць у доме для састарэлых у Трасцянцы. І цікавая справа: дзяўчаты не былі знуджаны сваёй п'есай! Бо праўда такая: чамусьці сярод гімназістаў няма ўжо таго захаплення сцэнай...

Сапраўды, самай яркай пастаноўкай лічу спектакль „Брыдкае качаня", якое паказалі дзеткі з беластоцкай „чацвёркі". Праўда, у поўным захапленні замінала мне адна акалічнасць.

Гайнаўка, пасля выступу

„Як мужык гусей дзяліў"

„Сям'я Міхальскіх"

„Тры парасяты"

Памятаю гэтую пастаноўку ў лепшым выкананні ранейшай групы з той жа „чацвёркі". Наогул, калі ідзе пра сёлетні тэатральны агляд, цяжка гаварыць пра нейкія з'явы ці зоркі... Але пры ўсім сказаным трэба належным чынам ацаніць іх за ахвоту выступаць на сцэне па-беларуску. І гэта зрабіла камісія (Яніна Плютовіч, Васіль Сегень, Лена Добаш), якая ўзнагародзіла ўсіх выступоўцаў і інструктараў ды прызначыла ім прыстойныя грашовыя ўзнагароды.

Тэатральны агляд для школьнікаў традыцыйна ўжо сарганізавалі Таварыства беларускай культуры, Беларускае грамадска-культурнае таварыства і Культурны цэнтр Беларусі. Мерапрыемства адбылося 26 мая г.г. па вуліцы Варшаўскай у Беластоку.

Фота і тэкст: ЗОРКА



„Казка пра рыцара без каня"

А ВОСЬ І ВЫНІКІ:

Гран-пры:

Тэатр з ПШ № 4 у Беластоку (у якім іграюць гімназісты з Гімназіі № 7) — паказалі спектакль „Казка пра рыцара без каня" (апякун: Аліна Ваўранюк)

І месца:

Тэатр з ПШ № 4 у Беластоку — „Брыдкае качаня" (апякун: Аліна Ваўранюк)

Тэатр з Гайнаўскага дома культуры — „Казка пра пеўніка і лісу" (апякун: Вера Масайла)

Тэатр з Орлі — „Сям'я Міхальскіх" (апекуны: Ала Зіневіч і Марыя Тамчук).

ІІ месца:

Тэатр з Нарвы — „Пярэстая красуля" (апякун: Ніна Абрамюк)

Тэатр з Бабік — „Як мужык гусей дзяліў" (апякун: Тацяна Андрацкая)

ІІІ месца:

Лялечны тэатр з Рыбалаў — „З рога ўсяго многа" (апякун: Лідзія Мартынюк)

Тэатр з ПШ №4 з Беластока — „Тры парасяты" (апякун: Аліна Ваўранюк)

Вылучэнне:

Тэатр з Бабік (малодшая група) — „Піражок" (апякун: Тацяна Андрацкая)

ГІСТОРЫЯ ПРА ТОЕ, ЯК ПРАВІЛЬНА ТРЭБА ЎМЕЦЬ АДМАЎЛЯЦЬ

І быў у той дзень — такі цудоўны вецер.

А Маргарытка — хацела прызнацца ў каханні Зміцеру. Так хацела, што нават аблачынкі зрэдчас ранялі кропелькі на белыя бярозы, свежае зяленіва, на гэтае дзіўнае, сцішанае лета, якое толькі пачыналася.

Але Зміцер — калі Маргарытка прыйшла, калі спынілася і ўжо хацела ціха і пяшчотна крануцца ягонай рукі — нібы штосьці адчуў і замёр, збянтэжаны. А потым — сам першы крануўся рукі дзяўчынкі ды сказаў...

Не, нічога не сказаў дзяўчыне юнак. Ён так далікатна, так ледзь кранальна і адначасна з такой душэўнай мілотай і сілай пацісну яе тонкія пальчыкі, так раптам у нейкім вільготным, сардэчным парыве паднёс іх да вуснаў — што Маргарытка сама ў нечаканым дзіўноцтве ўскінула на яго вочы і — і ўсё зразумела.

І, ведаеце, шаноўныя мае, хацела спачатку заплакаць. Але Зміцер, сам прыціхлы, і нечакана прасвятлелы, і дашчэнту ап'янелы дзявочай прыгажосцю, сціплай адкрытасцю, мілай беззабароннасцю — так асцярожна, і так нячутна крануўся вуснамі (як умее кранацца не толькі прыгожы, але і крыху разумны юнак) шчакі дзяўчыны — што яна не толькі не заплакала, а шчыра, нават весела яму ўсміхнулася.

І толькі цяпер юнак здолеў прамовіць некалькі кароткіх, але такіх важных фраз:

— Маргарытка! Я ведаю, што хацела ты мне сказаць. Ты — самая цудоўная дзяўчынка на свеце. І таму — я хачу, каб калі-небудзь твае словы пачуў той, хто болей іх годны.

І не юнак, і не дзяўчына смяяліся і адначасна плакалі ў той дзень. Гэта так смешна дзьмуў навокал такі цудоўны і крыху здурэлы вецер, гэта лёгкія аблачынкі зрэдчас ранялі кропелькі на белыя бярозы, свежае зяленіва, на гэтае дзіўнае, сцішанае лета, якое толькі пачыналася.

Ваш Дзядзечка Сід

1 чэрвеня 2009 г., Кобрын

Міра ЛУКША

Цецерукі з Церамкоў

Цецярук той зваўся Ціт.
А цяцерачка — Цацылія.
У Церамках цягнулі плыт
сямейны, казалі — ідылія
панавала ў іх радні, але ж і
звалачыўся ў Церамкі
цецярук замежны.
Цяцер аж з Амерыкі!
Цэзар — цяцер-кавалер,
багаты, шыкоўны,
гэта ўсё не напавер,
бо піўніцы поўныя,
і аўто, і новы дом
на ўчастку пад лесам...
Ціту хоць у бук бі лбом
(а не ёсць балбесам), —
не пакажацца як ён,
бо сам небагаты,
і на выгляд не відзён,
і скромная хата...
Вось, цікава будзе ці
Цацылія ачнецца
і адважыцца пайсці
за розумам, сэрцам.
Бо ж не пёры і не шык
ёсць жыцця аснова.
Дуне вецер — толькі „пшык"
ды смецце-палова
з ненадзейнае красы,
з ганарлівых званняў.
Не віна нам, а расы
напіцца ды жыць у каханні.

Музыка з кайфам

„Акапа-NHS" — Новы Госць на Сцэне

Фольк-музыку скланяюць сёння на ўсе магчымыя спосабы, якіх не вазьмуся пералічваць. Традыцыйна фальклорная музыка даволі часта выконваецца ў арыгінале, бо паўстаюць або моладзевыя калектывы, або гурты сімпатыкаў белага спеву. Аднак цяпер больш папулярным напрамкам у музыцы з'яўляецца этна. Дзейнічаюць этнагурты, выконваюцца этнапраекты, існуе фольк-мадэрн, нават этнафольк, сустрэнеце і этна-джаз!

„Архаічная філасофія ўсходніх славян і экспансіўны ўплыў заходняй цывілізацыі" перасякаецца ў музыцы ўзыходзячых, беларускіх зорак з гурту „Акапа-NHS". Займаюцца яны выяўленнем аўтэнтычнага песеннага мастацтва старажытных беларусаў, але прапануюць яго ў сучасным соўсе. А спяваюць у гурце не абы-хто: выпускніцы Мінскага музычнага вучылішча ім. Глінкі, а таксама зорка беларускай рок-музыкі, вакалістка гурту „Індыга" — Руся. Але „Акапа-NHS" гэта не толькі спеў, але таксама інструментальная аранжыроўка ў форме бубнаў, кларнета ды саксафона, якім валодае Ілья Дзьмуха, раней вядомы з гурту „Сцяна". Гурт „Акапа-NHS" зараз дасканала ўпісваецца ў напрамак „Ethno world music" і такім шляхам накіроўваецца. Сустрэла я зусім нядаўна іх прапанову да вядомага ў свеце фестывалю „Усадзьба. Джаз". Песня прыгожая, але канкурэнцыя вялікая. Нягледзячы на тое, што ў конкурсе ўдзельнічаць ім не давядзецца, то „Акапа-NHS" мае за сабой шмат поспехаў, між іншым, на люблінскіх „Мікалайках фолькавых" у 2006 годзе ці фэсце альтэрнатыўнай музычнай культуры „Адліга" ў Мінску, а таксама выступленні ў цікавых месцах, у тым ліку на фэсце маскоўскай кансерваторыі „Сусвет гуку". Галоўнае, што пазітыўна накручваюць Беларусь, а асабліва Мінск, дзе ў мясцовых клубах даволі часта адбываюцца фольк-канцэрты.

Напрыканцы 2007 г. гурт запісаў альбом, які ў сваім жанры стаў адным з лепшых альбомаў мінулага года ў Беларусі. Дацэньваюць яго і крытыкі, і слухачы. Застаецца толькі чакаць чарговых поспехаў і канцэрта на Падляшшы.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 24

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 20:

Фа, луг, сяло, Сувалкі, сава, галава, акула, яд, Мая. Вус, гад, гусак, валун, авал, слава, як, лік, но, імя.

Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Радаслаў Сідарук, Войцех Лаўрыновіч, Магда Свентахоўская, Яраслаў Нічыпарук, Давід Анішчук, Ілона Анішчук** з Новага Корніна. Віншуем!



Харавое двухгалоссе

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Галіна Ур'еўская-Еўсюкова ды Павел Шэпелеў з'яўляюцца дырыжорамі-харавікамі. Галіна вядзе Узорны хлапечы хор Светлагорскай мастацкай школы, а Павел — студэнцкі хор „Cantus Juventae" Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Абое прысвячаюць сябе працы з дзяцьмі і моладдзю, але, як самі кажуць, гэта перш за ўсё выклік:

— Праца з дзяцьмі гэта не толькі развучванне песень, — кажа Галіна, — гэта перш за ўсё вывучанне жыцця. Мы вучымся як весці сябе на сцэне, як весці сябе ў грамадстве, як есці і як лягаць спаць, а таксама як знайсці кантакт з другім чалавекам.

— Асноўнае ў маёй працы, — дадае Павел, — пераканаць, што харавы спеў самы цудоўны ў свеце.

Хор Галіны — адзіны такі хор у Гомельскай вобласці (для параўнання, дзявочых хароў болей дзесяці), даволі малады, бо створаны ў 2003 годзе. Лінгвісты маюць за сабой даўжэйшы шлях.

— Хор узнік у 1986 годзе, спачатку як дзявочы ансамбль, але хутка далучылася да яго мужчынская група. Я працую з хорам чатыры з паловай года, — прызнаецца Павел Шэпелеў. — Хачу працягваць паспяховыя традыцыі і ўтрымаць мяшаны састаў, але гэта складана, бо ў нашым Лінгвістычным універсітэце восемдзесят працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў складаюць дзяўчаты. Рэпертуар разнастайны, старадаўнія духоўныя кампазіцыі, а таксама песні сучасных аўтараў ці народная творчасць розных нацый, а гэта лёгка спяваць, бо нашы студэнты — шматмоўныя.

Сёлета абодва хары ўпершыню змагаліся за прызнанне на Міжнародным фестывалі царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2009". За прызнанне, за месца ды самі з сабой, выконваючы патрабавальны, царкоўны рэпертуар.

* * *

— Народныя і іншыя песні спяваем, — кажа хор малых хлопчыкаў.

— Але тут царкоўная музыка, — гавару.

— Тааак, але гэта цяжка спяваць, бо трэба быць вельмі ўважлівым, сціплым, увесь час глядзець на дырыжора, — пералічваюць малышы.

— Мне сем гадоў, мне дзесяць, мне чатырнаццаць, — адказваюць на чарговае пытанне.

— Я працавала з дарослымі, але напэўна нашмат цяжэй займацца дзяцьмі, — расказвае дырыжор Галіна Ур'еўская-Еўсюкова. — У дзяцей свая фізіялогія, свой свет, гэта асобная планета. Калі іх не любіць, няма сэнсу займацца працай з імі, бо гэта было б за цяжка і ў фізічным, і ў псіхалагічным плане.

— Наш дырыжор бывае вельмі жорсткі, — кажуць мінскія студэнткі, — але ў нас з ім вельмі чалавечыя адносіны.

— Ён шмат ад нас патрабуе, а мы мусім з усім справіцца.

— Але ён такі чалавек, што ўмее за сабой павесці, мае такую харызму.

— Дзяцей трэба закахаць у музыку, якой займаюцца, — дае рэцэпт дырыжор са Светлагорска. — Мы штодзень выконваем народную творчасць і кожны выступ гэта спектакль, пластычны рух, кожны з хлопчыкаў гуляе, з'яўляецца акцёрам. А калі ідзе пра царкоўны рэпертуар, то вынікі атрымліваюцца... праз паслухмянасць, супакаенне, цярпенне. Правільна сказаў адзін бацюшка, што малітва і праца гэта два крылы ў чалавека.

Дзецям цяжка на гэтых крылах ўзняцца да нябёсаў царкоўных выканаўняў, але калі ёсць зразуменне ў дырыжора і пашана ў дзяцей, усё, як відаць, можа атрымацца.

Узорны хлапечы хор Светлагорскай мастацкай школы

— Няма межаў дасканаласці і можаш гэта паўтараць шэсць тысяч разоў, — працягвае „другая мама" хлопчыкаў, — а на шэсць тысяч першы раз... напэўна будзе лепш (*смех*). Мае хлопцы стараліся спяваць як найлепш, але я ведаю, што маем яшчэ над чым працаваць, а шлях у космас далёкі. У час выступаў я зразумела, што тут не прыязджаюць слабыя хары, тут спяваюць самыя моцныя, гэта цудоўны калейдаскоп.



„Cantus Juventae" — хор мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта

— Я марыла пра ўдзел у фестывалі царкоўнай музыкі, — кажа Маша, — і вось здзейснілася!

— Маша таксама марыла праспяваць Бартнянскага і сёння будзем спяваць, — цешацца дзяўчаты.

Спяванне царкоўнай музыкі, паводле мінскіх харыстак, патрабуе вялікай самадысцыпліны, вялікай адказнасці. Забірае шмат энергіі і выклікае многа эмоцый, але кажуць, што варта ўсё гэта перанесці. Для прыемнасці і задавальнення.

— Калі спяваем адну песню, мы — адно цэлае, — раскручваюцца дзяўчаты. — А калі нехта кажа, што хор гэта занятак для бабулек і дзядуляў, проста не паспрабаваў, бо спяваць з іншымі людзьмі адну песню... штосьці цудоўнае.

— Я спявала ў музычнай школе, таму на ўніверсітэце таксама паступіла ў хор. Калі чалавек паспрабуе, не ўмее ўжо гэтага пакінуць.

Падтаквае гэтаму і Галіна:

— Калі дзеці пачынаюць спяваць, то застаюцца з гэтым спевам. Жаль, што з нашага маленькага гарадка нашы падапечныя выязджаюць вучыцца ў большыя гарады, але ведаю, што і там працягваюць сваю харавую прыгоду. Вельмі цешуся, што сярод маіх вучняў ёсць ужо таксама маладыя дырыжоры.

Шмат цярплівасці патрабуе ў дырыжораў праца з маладымі людзьмі, але і яны мусілі прайсці дарогу, якая дазволіла зразумець сутнасць сваёй працы і царкоўнага спеву.

— Адраджэнне праваслаўя збеглася ў часе з маім завяршэннем вучобы, — адлятае ва ўспаміны Павел Шэпелеў, — але ўжо ў 15-16-гадовым узросце мы з педагогамі хадзілі спяваць у царкве. У 1990-х гадах паўставалі новыя прыходы і там наша харавая афарбоўка была вельмі патрэбная. Мы тым самым сплачвалі свой доўг. Гэта запала глыбока ў сэрца. За гэтыя ўсе гады я жыў неяк побач з царквою, хаця я ўжо не такі царкоўны. Дзесяць гадоў праспяваў у хоры пад кірункам І. Дзянісавай. З праваслаўем я вырас і таму можа ў мяне, дазвольце так сказаць, разуменне царкоўнага спеву.

Хор хлопчыкаў, хаця заснаваны перад усім для прыцягнення дзяцей да гэтага высакароднага мастацтва праз гульню і народную творчасць, зараз намнога часцей выступае пры нагодзе царкоўных мерапрыемстваў.

— Царкоўны рэпертуар раней здараўся нам эпізадычна. Для гэтага фестывалю мы падрыхтавалі адмысловую, вялікую праграму, над якой працавалі цэлы год. Мы два гады чакалі прыезду на фестываль, але варта было б чакаць і даўжэй, бо гэтае мерапрыемства — нібыта з'ява, пышныя залы, людзі. Проста цуд.

Пасля конкурсных праслухоўванняў хары сыходзілі са сцэны вельмі ўсхваляваныя. Хлопцы — з чырвонымі шчочкамі, а іх старэйшыя мінскія сяброўкі — са слязамі ў вачах. Усе навокал захапляюцца, а яны перажываюць усё ўсярэдзіне.

— Спадар Шэпелеў, скажыце, калі ласка... — бегаюць журналісты.

— Дазвольце мне момант адпачыць, сабраць думкі, — адказвае.

Перажываў, так як і ягоная моладзь, але яшчэ перад канцэртам, поўнасцю натхнёны і сканцэнтраваны сказаў:

— Я бачыў як мае студэнты прымаюць прычасце, таму царкоўная музыка гэта і іх жыццё. Ніколі не адмаўляліся ад царкоўнага рэпертуару. Часта нават самі просяць больш кранальныя кампазіцыі, якія расчульваюць, хвалююць душу.

Мазахізм? Не, гэта ім проста дае радасць, а калі хваліць Бога спевам, дык толькі шчыра і з радасцю.

— Мне здаецца, што свет яшчэ не распаўся, бо ёсць царква, — з поўнай павагай кажа мінскі дырыжор. — Я стараюся гэта ўсвядоміць дзецям. Таксама ўдзельніцтва ў такім фестывалі паказвае, што цэлы свет займаецца царкоўным спевам, стараецца знайсці вышэйшы сэнс жыцця ў царкве і да яе звяртаецца з просьбай аб параду як трэба правільна жыць. Такія фестывалі не толькі нагода паехаць недзе за мяжу і паказаць сябе, а перш за ўсё ўзмяцняюць веру, што гэта аб'ядноўвае людзей розных народаў і кантынентаў.

* * *

— У нас ведаюць, што існуе хор, — распавядаюць студэнткі, — але трэба прайсці адбор.

— Мы шмат вучымся, бо і столькі патрабуе навука замежных моў. Нехта спортам займаецца, нехта нечым другім, але якраз на рэпетыцыях хору адпачываем.

— І сябруем! Сустракаемся на пікніках, паходах (*смех*). Спяваем пад гітару ці ідзем на дыскатэку.

— А прафесійныя мары ў вас ёсць?

— Хацелі б выступіць у Германіі і Італіі, бо там раней не бывалі. Увогуле выязджаем, на жаль, толькі раз у год, але чакаем выездаў. Шмат дзеля іх працуем і адчуваем тады вялікае задавальненне.

— А як вам Беласток?

— У Беластоку мы ўпершыню. Адрозніваецца ад беларускіх гарадоў, нягледзячы на тое, што калісь прыналежыў Беларусі (*смех*). Розніца ў атмасферы, штосьці ў паветры лунае...

Угодкі роду Луцкевічаў у Вільні

Тэкст і фота Алеся АДАМКОВІЧА

26 траўня ў Таварыстве беларускай культуры Літвы адбылася імпрэза, прысвечаная знакамітаму роду Луцкевічаў, пакінуўшаму адзін з найглыбейшых слядоў у беларускай культуры, стаяўшаму ля вытокаў стварэння БНР. Нагодай сталі чарговыя ўгодкі народзінаў Івана Луцкевіча.

Перад прысутнымі выступае Зянон Пазьняк

Нарадзіўся Іван Луцкевіч 28 траўня (9 чэрвеня) 1881 г. у Шаўлях. У 1902 г. скончыў Мінскую гімназію, адначасова ў 1902 г. — Археалагічны інстытут, у 1905 г. — Пецярбургскі ўніверсітэт. Быў адным з тых, хто зразумеў, што Беларусь мусіць быць незалежнай і разам з братам Антонам стаў ініцыятарам абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Памёр у Закапаным (Польшча) 20 жніўня 1919 г., а ў 1991 г. яго прах быў перавезены ў Вільню і перазахаваны на Росах. Як адзначыў Хведар Нюнька, у яго жыцці было і нешта містычнае. Ён нарадзіўся за 19 год да надыходу новага стагоддзя, і ў новым стагоддзі пражыў таксама 19 год. Але, нягледзячы, на такое кароткае жыццё, якое ў яго было сапраўды яскравым, надзвычай шмат паспеў зрабіць для свае Бацькаўшчыны-Беларусі. А самае галоўнае — дзякуючы яго высілкам і намаганням — мы сёння жывём у суверэннай краіне (без БНР не было б БССР). Ды і беларускае жыццё Віленшчыны без Луцкевічаў уявіць немагчыма. І тое, што тут і зараз лунае беларускі дух (праз столькі год вынішчэння, таптання, душэння праяваў беларускасці) вядома, заслуга і Івана Луцкевіча. Хай жа ў яго вечным сне бачыцца дэмакратычная і беларуская Беларусь.

Гэтым разам у Таварыстве прысутнічала шмат ганаровых гасцей. І адным з іх быў Зянон Пазьняк, той, хто стаяў ля вытокаў адраджэння беларускай нацыі ў канцы XX стагоддзя і стварэння сваёй нацыянальнай дзяржавы. Так, сёння яна прамаскоўская і знаходзіцца пад чарговай акупацыяй, але, так ці інакш, была створана па нацыянальнай прыкмеце і мусіла б быць дзяржавай беларусаў, толькі што далейшыя ўмовы склаліся так, што не атрымалася цалкам вырвацца з-пад амбіцый Крамля і сёння там праводзіцца палітыка па вынішчэнню тытульнай нацыі. І тое, што імя Пазьняка і сёння ўва ўсіх на слыху, і тое, што ён застаецца лідарам, пацвердзіў той факт, што зала ТБК была перапоўненай, і яе ў сваёй большасці напоўніла моладзь. Так, можна тут спрачацца, што лідараў у беларускай апазіцыі шмат, але альтэрнатыўнай фігуры пакуль што не існуе. І моладзь цягнецца за ім, і слухае яго прамовы, і разам з ім верыць у перамогу Беларусі.

Зянон Пазьняк засведчыў аб крыжовым шляху бацькаўшчыны і зазначыў тое, што яна сёння нікому непатрэбная, проста тут сустракаюцца інтарэсы розных груповак, якія хочуць знайсці сваю карысць. І калі мы не станем на абарону незалежнасці Беларусі і на шлях беларусізацыі, за нас ніхто гэтага не зробіць. Гульня Еўропы ў дэмакратыю — гэта толькі гульня ў дэмакратыю. Кепска тое, што апазіцыя раз'яднаная, але варта адзначыць, што яна састарэла на дадзены момант і не можа адпавядаць інтарэсам Беларусі. Якая б яна не была, павінна грунтавацца выключна на нацыянальных каштоўнасцях, інакш губляе свой сэнс (а мы зараз назіраем, што ў большасці іхніх праграм адсутнічае нацыянальная платформа, а маецца толькі дэмакратычная). І тут з Зянонам Пазьняком немагчыма не пагадзіцца. Вялікую занепакоенасць прамоўцы выклікае той момант, што зараз мы можам згубіць час, у які яшчэ магчыма адрадзіць бацькаўшчыну. Але надзея застаецца, і перш за ўсё на гэта ўказвае той крыжовы шлях, якім прайшла Беларусь цягам апошніх 200 год, калі страціла сваю незалежнасць і расійскі акупацыйны рэжым яе ўвесь гэты час вынішчаў, знішчаючы эліту нацыі, авангард, шляхту, інтэлігенцыю (культурны пласт), а пасля і сялянства (этнічны пласт), але яна выжыла. Магчыма, гэта знак таго, што Беларусь непераможная.

Зянон Пазьняк выказаўся і наконт Усходняга партнёрства і яго непакоіць той факт, што ў Еўропе назіраюцца тэндэнцыі па легітымізацыі рэжыму Лукашэнкі. Перш за ўсё за гэта выступае старая каланіяльная імперская Еўропа. А сам Еўрасаюз падзяліўся ў гэтым пытанні на два супрацьлеглыя лагеры. І тое, што Лукашэнкі не было на саміце ў Празе, сведчыць аб пэўнай перамозе каардынаваных дзеянняў беларускай апазіцыі, якая ўпершыню заявіла аб неабходнасці захавання беларускай культуры і мовы і толькі на такіх прынцыпах будзе будаваць незалежнасць Бацькаўшчыны.

Першым на імпрэзе выступіў студэнт 4 курса Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта Артур Юдзіцкі, які зазначыў аб тых палітычных праблемах, якія зараз назіраюцца ў Беларусі. Асноўная з іх — гэта набраныя Лукашэнкам крэдыты, якія трэба аддаваць, а ўлада не мае з чаго. Не абмінуў увагай і прэзідэнцкія выбары, якія павінны ў Беларусі адбыцца наступнай восенню.

Зянон Пазьняк пасля сваёй прамовы перадаў слова вядомаму перакладчыку з беларускай мовы на польскую Чэславу Сэнюху, які паходзіць з Беларусі. Спадар Чэслаў прамаўляў на добрай беларускай мове, прыгадаў не толькі аб крыжовым шляху нашае Бацькаўшчыны, але і Польшчы. Польшча, як ён адзначыў, у гэтай барацьбе згубіла 6 мільёнаў грамадзян, і перш за ўсё гэта былі маладыя, адукаваныя людзі. Спадар Сэнюх прыгадаў і аб сваім жыцці ў Беларусі, зазначыўшы, што найбольш спрыяльным да беларускасці з усіх акупацыйных рэжымаў быў нямецкі. Менавіта тады ён наведваў беларускую школу — іншых проста не было. Тады пазнаёміўся з беларускім нацыянальным рухам, з Саюзам беларускай моладзі, да якога ён належаў. І тады тут сутыкнуліся дзве плыні: нямецкая (акупацыйная) і беларуская (нацыянальная). Фашыстоўскі рэжым думаў як перацягнуць на свой бок насельніцтва, беларуская інтэлігенцыя думала як скарыстаць час акупацыі для развіцця беларускасці. І такім чынам, маючы падтрымку нямецкага кіраўніцтва, перад усім Вільгельма Кубе, беларусы пачалі ствараць свае нацыянальныя арганізацыі, адчыняць беларускія школы, выпускаць беларускія газеты і часопісы. На жаль, гэта не працягвалася доўга, бо хутка адных акупантаў змянілі іншыя, якія да беларускасці ставіліся варожа. І пачаўся чарговы крыжовы шлях бацькаўшчыны.

Намеснік старшыні КХП БНФ Сяргей Папкоў звярнуў увагу на эканамічныя цяжкасці, з якімі сутыкнуўся рэжым. Беларускую прадукцыю не купляюць, яна залежваецца на складах. І хутка прыйдзе той момант, калі не будзе чым людзям выплачваць заробкі.

Завяршыў імпрэзу Зміцер Дашкевіч, які сказаў цёплыя словы ў адрас Пазьняка, адзначыўшы, што спадар Зянон заўжды апярэджваў час на 10-15 год. У гэтым і была яго асноўная праблема. І зараз, сёння, Лукашэнка пачынае ўздымаць тыя праблемы і гаварыць аб тым, аб чым казаў Пазьняк у пачатку 1990-х гадоў.

І ў канцы хацелася б прывесці цытату з газеты „Голас беларуса" 1920-х гадоў невядомага аўтара, які звяртаўся да моладзі (калі б не было даты, можна было б падумаць, што ён напісаны сёння), якая застаецца актуальнай і ў наш час і наводзіць на некаторыя развагі:

Наш беларускі народ?..

Што можа даць ён у скарбніцу агульначалавечай культуры, што можа ён выявіць?..

Ці адшукае ён сваю „кветку-шчасця", ці счаруе сваім творчым геніем неаб'ятныя абшары беларускае зямлі-цаліны?

Ці разляціцца па свеце яго крылатая думка?..

Так. Ёсць аб чым цяпер падумаць нам, асабліва моладзі...

Бо стаімо мы перад будучыняй нашай, перад таёмнасцю нашага лёсу. Стаімо перад днём новым, даўно чаканым, перад бурным этапам нашае гісторыі.

(...)

Нашая воля. Ці дачакаемся, ці даб'емся?

У вялікіх муках радзілася яна на свет. Пад рокат гарматаў і ў завіруху рэвалюцыі прыйшла да нас ідэя нашае дзяржаўнасці, маладая чараўніца адраджэння.

(...)

А далей?.. Можа, на другі дзень волі спачыць духам. О, гэта была б самая вялікая памылка! Наш нацыянальны геній сялян і работнікаў беларусаў павінен будзе цвісці радугаю і счараваць не толькі нас. Наша гаспадарка, наша думка, наша песня, наша літаратура — усё нашае жыццё павінна будзе закрасаваць купальскімі кветкамі, кветкамі вясны і маладога шчасця, і тады можна будзе сказаць: „Так, Беларусы здольны быць народам".

XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы" і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб'яўляюць XII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы. У конкурсе будуць разглядацца працы грамадзян Польшчы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў дзвюх узроставых групах:

— **I група:** дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— **II група:** астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з'яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, набраныя на камп'ютары або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб'ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас: **Redakcja „Niwy", ul. Zamenhofa 27, 15-959 Białystok 2, skr. poczt. 84** з прыпіскай на канверце: XII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

7. Працы надасланыя аўтарамі ў мінулым годзе пераходзяць у сёлетні конкурс

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **12 лістапада 2009 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб'яўлены ў снежні 2009 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Конкурс праводзіцца дзякуючы фінансавай падтрымцы Міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі.

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!!!

Алесь Вярцейка

Трыялет

Не цурайся мовы роднай,
Без яе ты проста раб
Маеш мову — маеш скарб,
Не цурайся мовы роднай !
Колькі гукаў, колькі фарб,
Срэбра творчасці народнай
Не цурайся ж мовы роднай
Маеш мову — маеш скарб.

Гомель

Група: за і супраць

Група дэпутатаў звярнулася да маршалка Сейма Браніслава Камароўскага з заклікам заснавання польска-беларускай парламенцкай групы. Некалькі месяцаў таму ў час візіту ў Беласток запрошчаў да гэтага таксама пасол Беларусі ў Польшчы Віктар Гайсёнак. З нашых інфармацый вынікае аднак, што ўзнікненне такой групы, прынамсі ў найбліжэйшы час, малаверагоднае.

У час прэс-канферэнцыі старшыня падляшскай Грамадзянскай платформы Роберт Тышкевіч, старшыня сеймавай групы па справах Беларусі і віцэ-старшыня камісіі замежных спраў аднёсся да ідэі стварэння гэтай міжпарламенцкай групы. Мела б яна дзейнічаць на прынцыпах падобных да шасцідзесяці такіх двухбаковых груп, якія дзейнічаюць у Сейме (сярод іх ёсць, напрыклад, польска-малайская, -інданезійская, -філіпінская).

— Няма ў Сейме польска-беларускай парламенцкай групы, бо беларускі парламент не быў абраны згодна з дэмакратычнымі стандартамі. У гэтай сітуацыі дзіўным было б наладжванне з ім кантактаў, значыць, на найвышэйшым узроўні, — сказаў дэпутат.

Адзначыў:

— Лічу, што такія кантакты заўчасныя, паколькі ўсё ў Беларусі не захоўваецца шмат прынцыпаў звязаных з захоўваннем правоў чалавека, свабодай медыяў ці аховай нацыянальных меншасцей, між іншым і польскай. Незалежна ад гэтых засцярог, супрацоўніцтва з Беларусю павінна развівацца ў рамках „Усходняга партнёрства".

Таксама прадстаўнікі найбольшага апазіцыйнага сеймавага клуба — ПіС — супраць стварэння польска-беларускай групы.

— У Беларусі пануе дыктатура. Стварэнне гэтай міжпарламенцкай групы было б прызнаннем намі тамашняга парламента, а мы гэтага не хочам. Цяперашняй формы кантактаў дастаткова.

У сваю чаргу дэпутаты ад ПСЛ выказваюцца за заснаванне групы. Дэпутат ад гэтай групоўкі Тадэвуш Славецкі заяўляе, што з-за яе недахопу „церпяць нашы адносіны з Беларуссю" і „гэта недапушчальнае". Дэпутат ад ПСЛ Францішак Стэфанюк дадае:

— Беларускі парламент, таксама як і польскі, з'яўляецца членам Міжпарламенцкага саюза, які гуртуе парламентарыяў усіх краін.

У дэпутацкім абгрунтаванні аб неабходнасці заснавання групы чытаем, што павінна яна быць створана, таму што „ў Беларусі пражывае найбольш шматлікая польская меншасць у Еўропе, таксама ў Польшчы пражывае цалкам шматлікая група грамадзян РП беларускай нацыянальнасці, дзейнасць Групы можа эфектыўна падтрымаць мэты і задачы, акрэсленыя ва ўрадавай праграме „Усходняе партнёрства", адбываючыеся змены і відавочную паправу ўзаемаадносін Беларусі і ЕС, традыцыю шматгадовых сувязей і супольнай гісторыі нашых дзяржаў і народаў".

Аб заяве пададзенай маршалку Сейма з заклікам стварыць гэтую групу (прыйшла яна ў Канцылярыю маршалка 21 мая) расказаў нядаўна Польскаму прэсаваму агенцтву (ПАП) галоўны яе падпісант дэпутат, ад Лявіцы Вітальд Гінтаўт-Дзевалтоўскі. У сувязі з гэтым „Ніва" паставіла яму некалькі пытанняў. Вось ход нашай размовы.

— Як мяркуеце, ці ў Беларусі захоўваюцца правы чалавека, ёсць свабодныя медыі і захоўваюцца правы нацыянальных меншасцей, між іншым польскай?

— На гэтае пытанне я не магу адказаць прама. Я даўно не быў у Беларусі. З медыйных справаздач вынікаюць розныя высновы. Я мяркую, што там ёсць нешта для паправы. Мяркую, што ёсць выпадкі парушэнняў еўрапейскіх нормаў, але дзейнасць польска-беларускай парламенцкай групы можа паўплываць якраз на рашучую паправу таго становішча.

— А ці, на Вашу думку, цяперашні беларускі парламент быў абраны ў дэмакратычнах выбарах?

— Аб тым ведаюць тыя, хто назіраў за выбарамі і тыя, што арганізавалі і праводзілі выбары. Я не бяруся за такога тыпу ацэнкі.

— Дэпутат Роберт Тышкевіч заявіў, што ў рамках байкоту ніякі з еўрапейскіх парламентаў з беларускім парламентам не ўтрымлівае двухбаковых кантактаў. Ці стварэнне польска-беларускай групы ў гэтым кантэксце не будзе прэцэдэнтам?

— Я не ведаю дэпутата Тышкевіча і не ведаю, на якой падставе выказвае такія меркаванні.

— А чым польска-беларуская парламенцкая група мела б заняцца ў першую чаргу?

— Перш за ўсё — наладжваннем кантактаў. Будзе пастаўлена пытанне ацэнкі становішча нацыянальных меншасцей у абедзвюх дзяржавах, ацэнка эканамічнага, культурнага, грамадскага супрацоўніцтва, а таксама ацэнка ўзроўню ажыццяўлення нейкіх еўрапейскіх стандартаў у функцыянаванні дэмакратычнай дзяржавы.

— А аб чым польскія члены групы мелі б размаўляць з беларускай апазіцыяй?

— А чаму мелі б яны размаўляць з апазіцыяй?

— У згаданай размове з ПАП Вы заявілі, што група „будзе наладжваць кантакты так з беларускімі парламентарыямі, як і апазіцыянерамі гэтай краіны".

— Міжпарламенцкая група не мае на мэце супрацоўніцтва з апазіцыяй. Зразумела, гэта магчыма і такія сустрэчы не выключаны. У дзяржаве, з якой наладжваюцца парламенцкія кантакты, не ёсць аднак першай мэтай міжпарламенцкай, ні адной міжпарламенцкай групы, наладжванне блізкага супрацоўніцтва з апазіцыяй.

Еўрадэпутат Яцак Пратасевіч, старшыня групы па справах Беларусі ў Еўрапарламенце ў сваю чаргу сказаў нам коратка:

— Гэта заўчасная ініцыятыва. Беларускі парламент мае быць выбраны ў законны спосаб, а за выбраны ў недэмакратычны палічыла яго найбольш да гэтай ацэнкі ўпаўнаважаная арганізацыя — Арганізацыя бяспекі і супрацоўніцтва ў Еўропе (АБСЕ).

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

www.brestspring.org

Праваабарончае грамадскае аб'яднанне "Берасцейская Вясна"

Адной з найбольш сур'ёзных прэтэнзій, якія беларускім уладам прад'яўляюць міжнародныя арганізацыі, у тым ліку і Еўрасаюз, з'яўляюцца грэблівыя адносіны да правоў чалавека. Прычым памагатыя Лукашэнкі не толькі зневажаюць гэтыя правы, але і робяць усё, каб арганізацыі, што іх адстойваюць, не маглі нармальна працаваць. Прыкладам гэтаму — гісторыя з Праваабарончым цэнтрам „Вясна", які быў ліквідаваны ўладамі яшчэ ў 2003 годзе. Праўда, ліквідаваўшы афіцыйна агульнабеларускую структуру, немагчыма адразу знішчыць жаданне людзей на перыферыі адстойваць свае правы і аб'ядноўвацца дзеля гэтага ў рэгіянальныя арганізацыі. Адной з іх і з'яўляецца „Берасцейская Вясна".

Сайт брэсцкіх праваабаронцаў месціцца па адрасе http://brestspring.org. Для сайта праваабарончай накіраванасці ў правінцыі выглядае ён больш чым выдатна. Па шчырасці сказаць, знайсці яму нешта падобнае ў Байнэце вельмі цяжка, калі ўвогуле магчыма.

Першая старонка „Берасцейскай Вясны" ў віртуальнай прасторы падае апошнія навіны. Адметна, што ўсе яны тычацца выключна Брэсцкай вобласці, а таму з іх можна атрымаць вычарпальную інфармацыю аб палітычным і праваабарончым жыцці рэгіёна.

На левым баку выяўлення знаходзяцца выйсці да рубрык сайта. Іх не надта многа — усяго пяць, але яны падаюць даволі поўныя звесткі як пра праваабарончую дзейнасць, так і пра брэсцкі рэгіён.

„Рэдакцыя гэтага сайта бярэ на сябе абавязак інфармаваць грамадства аб падзеях, звязаных з парушэннямі правоў чалавека і праваабарончай дзейнасцю ў г. Брэсце і Брэсцкай вобласці, — распавядаюць пра свае мэты брэсцкія праваабаронцы. — Момант ліквідацыі ў 2003 г. Грамадскага аб'яднання Праваабарончы Цэнтр „Вясна" падштурхнуў берасцейцаў да ўтварэння праваабарончага сайта „Берасцейская Вясна" як сімвала Беларускага праваабарончага руху".

Наступнай рубрыкай ідзе „Пра рэгіён". Менавіта там зацікаўленыя Берасцейшчынай даведаюцца амаль пра ўсе падрабязнасці палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця кожнага яе раёна. Такая інфармацыя падаецца ў падрубрыках гэтай старонкі. Таксама на іх месцяцца звесткі гістарычнага і культурнага характару.

Афармленне старонкі „Прававая інфармацыя" пакідае пытанні. Тое, што там месцяцца ў розных фарматах такія дакументы як Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, два факультатыўныя пратаколы да яго і Выбарчы кодэкс Беларусі — гэта зразумела. Пытанні выклікаюць фотаздымкі, змешчаныя на старонцы. Хто на іх змешчаны і калі гэтыя людзі былі знятыя — даведацца з інфармацыі на сайце немагчыма. Такіх недарэчнасцей варта пазбягаць, бо сур'ёзнаму сайту, тым больш праваабарончай накіраванасці, нельга мець штосьці незразумелае для кожнага карыстальніка, нават выпадковага.

Яшчэ адной недасканаласцю „Берасцейскай Вясны" з'яўляецца рубрыка „Кантакты". Там, акрамя адрасу электроннай пошты і непадпісаных фотаздымкаў, няма нічога. Да каго звяртацца, ад каго чакаць дапамогі — інфармацыі на гэты конт на старонцы няма. Не надта зразумелай у гэтым рэчышчы з'яўляецца і „сціпласць" брэсцкіх праваабаронцаў — пра сябе яны не падаюць ні імёнаў, ні тэлефонаў.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Свята ўдалося

Футбольная дружына Беларусі ў адборавым матчы да чэмпіянату свету супраць Андоры, які прайшоў у мінулую суботу ў Гродне, упэўнена разграміла саперніка — 5:1. Свята футбола ў горадзе над Нёманам, дзе ўпершыню ў гісторыі прайшла сустрэча такога роўню, удалося. Сведкамі таму былі 9 тысяч гледачоў, што таксама ўпершыню бітком запоўнілі новы стадыён.

Беларусы мусілі перамагаць карлікавую ў спартовым сэнсе дзяржаву пры кожным раскладзе. Мяркуйце самі — у Андоры зарэгістравана ўсяго каля 120 футбалістаў, з якіх права гуляць за нацыянальную зборную маюць толькі 40. З іншага боку памяць трымала параўнальна нядаўнюю паразу Беларусі ў афіцыйным матчы ў Гомелі ад Люксембурга. Ды і тым жа андорцам, праўда на іх полі і ў таварыскім спатканні, некалі ўмудрыліся саступіць. Наш склад зараз быў аслаблены адсутнасцю траўмаванага нападніка Віталя Кутузава. Ён, дарэчы, у канцы мінулага тыдня прадоўжыў кантракт са сваім італьянскім клубам „Бары", які сёлета выйшаў у „Серыю А". Новае пагадненне падпісанае яшчэ на адзін сезон. Не гуляў таксама з-за перабору жоўтых картак ключавы апорны хаўбек Аляксандр Кульчы.

На гэты раз абышлося без нечаканасцей, калі не лічыць недарэчны 11-метровы ў беларускую браму на 95-й хвіліне. Экспрэсны гол у самым пачатку гульні па добраму разняволіў падначаленых Бернда Штанге. У выніку па два галы забілі форварды Генадзь Блізнюк і Сяргей Карніленка, яшчэ адзін трапны стрэл запісаў у свой актыў паўабаронец Цімох Калачоў, які вырас у сапраўднага лідара каманды. Радуе, што стабільна стаў забіваць у розных матчах Карніленка, а Блізнюк, які зараз без клуба, упэўнена давёў усім скептыкам свой прафесіяналізм. Кіраваў беларускім аркестрам Аляксандр Глеб, бліжэйшая клубная будучыня якога пакуль цьмяная. Наша зборная была блізкая да таго, каб здабыць рэкордную вікторыю ў афіцыйных матчах у сваёй гісторыі, але на апошніх секундах арбітр сустрэчы прызначыў у браму беларусаў спрэчны пенальці і андорцы размачылі лік. Тым не менш, другая запар вікторыя з аднолькавым лікам 5:1, чаго раней ніколі не здаралася.

У нашай групе адбыліся яшчэ два матчы. Дружына Англіі прагназавана з буйным лікам адолела ў гасцях Казахстан — 4:0, а Украіна ў прынцыповым паядынку ў гасцях падзяліла ачкі з Харватыяй — 2:2. Абсалютным лідарам спабору ў нашым секстэце з'яўляецца Англія, якая мае 18 пунктаў і толькі тэарэтычна можа страціць першае месца і пуцёўку ў фінальную частку чэмпіянату свету. Другімі пакуль ідуць харваты — 11 ачкоў. На 3-е месца выйшла Беларусь — 9, за якой услед Украіна — 8. Заўважу, што ў нашых і ўкраінцаў праведзена на матч меней. Наступны матч беларусы згуляюць дома 12 жніўня супраць харватаў; ён і пакажа ці ёсць у нашай дружыны рэальныя шанцы на другое месца.

Тым часам моладзевая футбольная зборная Беларусі ва ўзросце гульцоў да 21 года рыхтуецца да галоўнага для сябе форуму. Перад фінальным турнірам чэмпіянату Еўропы, што пройдзе ў Швецыі, у фінскім горадзе Валкеакоскі, без 4 гульцоў асновы, якія былі ў стане галоўнай каманды краіны, яна прайграла камандзе суомі — 0:1. Адзіны мяч быў забіты з пенальці на 14-й хвіліне. Першы матч у Швецыі каманда Юрыя Курненіна згуляе ў Мальмё 16 чэрвеня супраць гаспадароў поля, 19 — гульня з сербамі, а 23 — заключная сустрэча ў групе з Італіяй. Патэнцыял у нашай маладой каманды высокі. Ці здолее яна яго рэалізаваць?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Зварот да былых жыхароў Рудні

Паважаныя землякі-рудняне!

Звяртаюцца да Вас Марыя Хлябіч, Віктар Бура і Жорж Зюзя — члены Арганізацыйнага камітэта „Сустрэча руднян — 2009”. Сёлета будзе гэта ўжо трэцяя наша сустрэча. Прапануем сабрацца 19 верасня — у суботу перад Прачыстай. Думаем, што добра было б штогод збірацца па суботах перад прыхадскім святам, паколькі з гэтай нагоды ў мінулым сустракаліся нашы продкі і мы пакуль існавала Рудня. Час ад часу і нашы сустрэчы будуць адбывацца на Прачыстую (21 верасня), калі гэтае свята прыпадзе ў суботу.

Прапануем наступны парадак сустрэчы:

9:30-11:00 — літургія і малебен у царкве ў Юшкавым Грудзе;

11:00-11:30 — абмеркаванне арганізацыйных спраў;

11:30-12:00 — пераезд да помніка ў Рудні;

12:00-12:30 — малітва каля помніка;

12:30-12:50 — пераезд у клуб „Карына” каля Лукі;

12:50-13:30 — лекцыя на гістарычную тэму;

13:30-13:40 — абмеркаванне наступнай сустрэчы;

13:40 — абед і сяброўская частка сустрэчы.

Аднак з арганізацыяй сустрэчы звязаны непазбежныя кошты: пісьмы, тэлефоны, абеды, лекцыя, запрошаныя госці (тыя, якія памагалі пры пабудове помніка ў Рудні) і іншыя. Прадбачваецца, што кошт сустрэчы складзе 40-50 зл. ад асобы. Чым нас будзе больш, тады кошт будзе меншы. Заахвочваем прыязджаць з сем’ямі, каб нашы дзеці і ўнукі пазнаёміліся між сабою і пераняслі ад нас традыцыю ладжання сустрэч. Просім даць папярэднюю інфармацыю аб сваім удзеле (колькі асоб) да 30 чэрвеня 2009 г. на адрас Марыі Хлябіч. Калі хто-небудзь захоча ў якойсьці частцы выступіць спонсарам сустрэчы, просім паведаміць Арганізацыйны камітэт. Просім таксама дасылаць свае заўвагі, пытанні і прапановы да праграмы сустрэчы.

У клубе „Карына” можна заказаць начлегі: тэл. 085 717 62 05, 502 265 487 (сп. Ляткоўскі).

Чакаем водгуку ад Вас.

Сустракаймася ў пачуцці супольнасці, з якім жылі ў Рудні нашы бацькі, дзяды і прадзеды — нашы продкі!

Шаноўныя рудняне і жыхары суседніх вёсак, якія апынуліся пад вадой: Боўтрыкаў, Гарбароў, Лукі і інш.: Будзьма сабою! Будзьма разам!

З сяброўскімі прывітаннямі ад імя Арганізацыйнага камітэта —

Віктар БУРА

Адрасы арганізатараў сустрэчы:

Maria Chlabicz, Rybaki 8, 16-050 Michałowo, tel. 085 717 61 39

Wiktor Bura, Rybaki 6, 16-050 Michałowo, tel. 085 717 61 88

Jerzy Ziuzia, ul. Fr. Kawy 20/6, 01-496 Warszawa, tel. 022 409 23 52, 664 157 968

У цяжкую хвіліну

Калі ўся мая сям’я жыла яшчэ ў старой хаце і вечарамі мы выпляталі каробкі, тады ў нашу хату часта заходзіў на вечарынкі дзядзька Трахім Панфілюк і расказваў пра эпізоды са свайго жыцця; запамятаўся мне адзін з іх.

Пры санацыі Трахім не мог настаўнічаць — дарэчы, як і ўсе нашы землякі — па той простай прычыне, што мы лічыліся людзьмі другой катэгорыі; мог настаўнічаць толькі той, хто верна служыў санацыі, аднак такіх людзей было вельмі мала.

Трахім меў сярэднюю адукацыю і абшырныя веды. Апрача гэтага дзядзька Трахім быў дасканалым краўцом; была ў яго швейная машына „Зінгер”. Аднойчы Трахіма наведаў наш бацюшка Міран Сянкевіч (той самы, пра якога я калісь пісаў, як ён дубінкай „ахрысціў” тафілаўскіх кавалераў за іх непрыстойныя паводзіны). Бацюшка Міран заказаў у Трахіма святочны касцюм з прынесенага ім сукна. Было гэта ў той час, калі Трахім быў ужо жанаты і меў за сабою тры гады (1927-1930) цяжкай палітычнай турмы, але пацыху надалей падпольнічаў. Неўзабаве пасля заказу касцюм быў пашыты і бацюшка з’явіўся ў краўца, пытаючы, колькі плаціць за работу. Трахім назваў невялікую суму, якая здзівіла заказчыка настолькі, што той перапытаў яшчэ раз ці гэта не замала. Трахім пацвердзіў раней сказанае, бацюшка заплаціў і сардэчна падзякаваў. На развітанне Трахім папрасіў бацюшку падтрымаць яго ў цяжкую хвіліну. Міран абяцаў пра гэта помніць.

Гэтакая хвіліна неўзабаве настала, бо нейкі правакатар данёс паліцыі, што Трахім надалей вядзе падпольную дзейнасць. З Бельска прыехалі на веласіпедах два паліцыянты арыштаваць Трахіма. Аднак найперш яны заехалі да бацюшкі Мірана, каб той даў ім характарыстыку падазронага. Міран адказаў ім:

— Адчапіцеся ад гэтага чалавека, бо ён парадачны грамадзянін і кравец; я ручаюся за яго! А той хто данёс — дурань, і не верце яму, але верце мне.

Паліцыянты былі такім адказам задаволены, бо навошта ім лішні цяжар — весці скованага чалавека аж у Бельск — і з палёгкай вярнуліся ў свой камісарыят.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Чужое хваліце...

Спатрэбіўся мне апырсквальнік для гародніны. Наведаў я чаромхаўскія крамы ў цэнтры ды на рыначку ў прыватнікаў пытаўся, але не знайшоў патрэбнай прылады. Меркаваў ужо ў Гайнаўку з’ездзіць, калі ўспомніў пра краму „Гаян” па вуліцы Бжазовай. Уладальнікам згаданай крамы з’яўляецца Янка Габрышук. Раней ён працаваў на чаромхаўскай бензастанцыі. Калі змяніўся прадпрымальнік аўтазапраўкі ЦПН, тады Янка адкрыў сваю фірму. Было гэта ў кастрычніку 2005 года. А гандлёвай кемлівасці маладому прадпрымальніку хапае. Забяспечвае ён краму таварамі, якія ў гаспадарцы неабходныя. Калі я запытаў прадаўца пра асартымент тавараў, гэты адказаў з усмешкай:

— Прадаем усё, апрача харчовых прадуктаў.

Сапраўды, крама багата забяспечана таварамі. А калі чго няма, дык прадавец неадкладна заказ прымае і нават большыя рэчы падвязе дахаты. Я купіў апырсквальнік дзевяцілітровай ёмістасці за 120 злотых ды цэментную загартоўку. Я пераканаўся, што нікуды за пакупкамі не трэба ехаць, калі на ўласным панадворку маем вялікі выбар тавараў, ветлівую абслугу і добрасумленных прадаўцоў.

Уладзімір СІДАРУК

Адгаданка

							1		2	3	4	5	6	7		8	9	10	11					
12	13	14	15	16		17	18	19	20	21	22	23	24	25	26	27	28	29						
					30	31	32	33	34	35		36	37	38	39	40	41	42						

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — італьянскую пагаворку.

1. марка магутных беларускіх грузавікоў = 2 _ 3 _ 4 _ 5 _ 1 _;

2. ручное прыстасаванне з пласцінак у выглядзе складнога паўкруга для абмахвання ў духату = 24 _ 26 _ 35 _ 32 _;

3. прастора для камунікацыі ў межах мясцовасці = 17 _ 20 _ 19 _ 23 _ 28 _ 25 _;

4. павага ў грамадстве = 36 _ 29 _ 39 _ 40 _ 33 _ 34 _;

5. форма чалавечага тулава = 14 _ 15 _ 16 _ 41 _;

6. вечназялёнае хвойнае дрэва сямейства кіпарысавых з дробным лускападобным лісцем = 37 _ 38 _ 8 _;

7. тэрмічны стан прадмета = 27 _ 42 _ 21 _ 22 _ 31 _;

8. вечназялёная расліна, лісце якой пры заварцы дае папулярны духмяны напой, напрыклад *Camellia assamica* = 12 _ 13 _ 9 _;

9. вялікі амерыканскі горад у штаце Ілінойс = 30 _18 _ 10 _ 11 _ 6 _ 7 _.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 19 нумара

Поспех, Лейбніц, пілюля, вінт, роспач, ялаўка, лубін, суша, Ян, чыранка, Маўр, Юра, чай, пяро, маладуха.

Рашэнне: **Лепшая творчая хлусня чым руйнуючая праўда.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін Вялікіх і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,7 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 200 egz.

Завяршэнне, адзнакі, тэатр...

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Сёлета завяршылі навучанне ў Беластоку ліцэісты: Міхась Каліна, Эва Сегень (узнагароды за дачку адбірае бацька), Кася Кузьміч, Наталля Швед, Наталля Рудчык

Урачыста і прыгожа развіталіся са школамі вучні, якія вывучаюць у Беластоку родную мову. Разам з імі настаўнікі, бацькі, дзяды ды іхнія сябры, таксама з літоўскай меншасці ў Польшчы. Гэта ўжо дваццацігоддзе ад часу, калі пачаў дзейнасць выхаджаны, выстараны беларускі дашкольны аддзел у самаўрадавым дзіцячым садку № 14 па вул. Пілсудскага 20/4, а ягоныя выпускнікі, перайшоўшы Пачатковыя школы № 4 і № 11, Публічную гімназію № 7, сёлета здабывалі атэстат сталасці ў агульнаадукацыйным ліцэі № 3 у Беластоку. Усхваляваная старшыня Згуртавання АБ-БА — таварыства бацькоў і вучняў вывучаючых беларускую мову — доктар Барбара Пякарская, маці дзвюх вучаніц, прыгадала ва ўступным слове ўсё як было, не абмінуўшы сітуацыі ва ўсёй краіне, якая натхніла яе пакаленне да паспяховых дзеянняў і дала сілу давесці справу да канца, прыгадаўшы 4 чэрвеня 1989 года, калі Іаанна Шчапкоўская сімвалічна аб'явіла ў тэлебачанні „канец камунізму" ў Польшчы:

— Гэты сімвал важны і для нас. Думаю, што без змены сітуацыі ў Польшчы не было б нас сёння тут, не было б навучання беларускай мовы ў Беластоку, як і не было яго на працягу чатырох дзесяткаў гадоў Народнай Польшчы. Гэтая дата важная першнаперш для нашага пакалення, пакалення сённяшніх бацькоў. Прыпомню: тады склалася Беларускае аб'яднанне студэнтаў, без сяброў якога цяжка мне ўявіць актыўнасць нашага грамадства ў першых часткова свабодных, а пасля поўнасцю свабодных дэмакратычных выбарах. Лозугам: „Беларусы! Пра нашы справы будзем гаварыць самі!" — мы тады ўпершыню ў пасляваеннай Польшчы адкрыта заявілі не толькі сваю прысутнасць, але таксама грамадска-палітычную пазіцыю (...) Колькі каштавала нас заснаванне беларускай мовы ў садку, а пасля навучання беларускай мовы ў школах Беластока, ведаюць тыя, між іншым, чые дзеці стануць сёння студэнтамі. Але мы не прасілі ў нікога змілавання, а патрабавалі таго, што нам і нашым дзецям належыцца. (...). Учора, напярэдадні сённяшняга свята Еўфрасінні Полацкай, апякункі Беларусі, мы маліліся ў царкве святога Юр'я ў Беластоку — маліліся за дзяцей, моладзь, настаўнікаў, бацькоў, за беларускі народ, за ўсё, што ўдалося нам зрабіць (...) Каб мы ставіліся з пашанай да чужога і з любоўю да свайго, як учора сказаў бацюшка Рыгор Місіюк. Бо мы, хоць іншыя, але ж не горшыя!

Былі падзякі бацькоў і дзяцей, медалі Заслужаных дзеячаў культуры для Барбары Пякарскай і Аліны Ваўранюк, падпісаныя міністрам культуры, пасведчанні, дыпломы і ўзнагароды ад „Нівы" вучням канчаючым навучанне ў пачатковай школе, гімназіі і ліцэі, нашым сябрам і прыяцелям — Дануце Курань, Анатолю Вапу, Асце Печуліс з Сейнаў. Сёлета завяршылі навучанне ў Беластоку ліцэісты Наталля Швед, Міхась Каліна, Кася Кузьміч, Эва Сегень, Наталля Рудчык. Атрымалі яны дарагія падарункі — выданні і альбомы ад рэдакцыі „Нівы", пасольства РБ, Асяродка культур і мастацтваў „Пагранічча", м.інш. Кнігу Вялікага Княства Літоўскага. Перадалі яны сваю багатую хроніку з навучання і ліцэйскага беларускага жыцця для новых запісаў малодшым калегам з III ліцэя. Адбылася і мастацкая прэзентацыя творчасці дзяцей і моладзі — спектаклі ў выкананні ўдзельнікаў тэатральнага гуртка „Гульня ў тэатр": лялечнае прадстаўленне твораў Віктара Шведа, „Казка пра рыцара без каня", „Прыгоды трох парасят", „Брыдкае качаня". Дзіцячая група Студыі аўтэнтычнага фальклору „Я нарадзіўся тут" спявала з вядучай Алай Каменскай. Беларуская і літоўская моладзь выступіла з праграмай „Вялікае Княства Літоўскае — наша супольная спадчына". Завяршыў сустрэчу канцэрт гурту „Клюквы", з якім працуе Ілона Карпюк.

Сцэна са спектакля „Рыцар без каня"

„Прыгоды трох парасят" — вучні з ПШ № 4



„Брыдкае качаня" выкананае з тэмпераментам!

„Мы нарадзіліся тут!" з Алай Каменскай

Наша спадчына — Вялікае Княства Літоўскае

13.06 — 19.06

(22.03. — 20.04.) Твой высілак не пойдзе ўпустую, калі нават будзеш мець пад горку. Удасца табе спалучыць прыемнае з карысным і максімальна выкарыстаць усе нагоды.

(21.04. — 21.05.) Спакуслівы раман можа аказацца быць вельмі небяспечным! Ты ўвесь час пад уплывам Марса, — баявіты, дзейнічаеш паспяхова. Для шмат каго акажашся быць маэстра! Людзі будуць трактаваць цябе як правадыра і мацука.

(22.05. — 22.06.) Будзеш быстры, шустры, кемлівы і дасціпны, адкрыты, камунікатыўны. Асабліва добрая кан'юнктура ў бізнесе, там моцнае ажыўленне. 16-20.06. шмат шчаслівых выпадкаў. Асцярожна наконт ветлівасці шэфа. Шчаслівы камень — рубін, лік — 2.

(23.06. — 23.07.) Добры час на стратэгічныя вырашэнні: 15-19.06. Эфекты дзеянняў на працы залежаць будуць ад падтрымкі ўплывовых асоб і калег. Трымайся цвёрда прынцыпаў. Заробіш столькі, колькі табе трэба.

(24.07. — 23.08.) Святло ў тунелі запаліць прыносячы шчасце Юпітэр 16-20.06. Дасканалы час на развіццё, ініцыятывы, адважнае рэалізаванне праектаў, найлепшы момант на падпісванне дамоў і негацыяцый: 15-20.06. Зважай на вірусы, зарана не кідай лякарстваў.

(24.08. — 23.09.) Будзь эластычны, не нагінай рэчаіснасці да сваіх патрэб ці ўяўленняў. Моцна ступай па зямлі. Здароўе неблагое, хоць можа дакучаць страўнік. Выкажашся ініцыятывай, зрэалізуеш амбітнае мерапрыемства, пры нагодзе даведаешся шмат цікавага.

(24.09. — 23.10.) Падарожжы будуць не толькі павучальныя, але і багатыя на новыя знаёмствы. Зважай на прафесійныя вырашэнні 15-19.06. — можа аказацца, што ад некаторых спраў трэба будзе хутка адмовіцца.

(24.10. — 22.11.) 13-15.06. — у гэты час можаш брацца за ключавыя вырашэнні. Можаш паспяхова задбаць пра амаладжэнне як фізічнае, так і духовае. Кінь наракаць! І не кантралюй іншых, бо адкінеш іх ад сябе.

(23.11. — 22.12.) Пераканаешся, што „вера пераносіць горы" (16-20.06.). Палічыш, што няма немагчымых рэчаў і выйграеш дзякуючы гэтаму. А ў хаце — як у сенсацыйным фільме. Ад паловы месяца задні ход Юпітэра паўплывае на тое, што твае планы стануць вельмі адлеглымі.

(23.12. — 20.01.) Новае пачуццё можа развінуцца маланкава. Пачнеш працаваць за двух, дык і зможаш здабыць шмат. Хопіць табе часу і на каханне, і на адпачынак, на ўсё, што нясе радасць. Будзеш моцны настолькі, што гэта ты будзеш дыктаваць умовы.

(21.01. — 19.02.) Цяжка цябе вырваць з хатняга гняздзечка. Можаш ангажавацца ў вялікі рамонт хаты (усё пойдзе спраўна). Ад кахання не ўцячэш. 15-19.06. хтосьці падвядзе цябе неадказнасцю, будзе ўцякаць ад абавязкаў і абяцанняў. Таксама з грашыма хістка.

(20.02. — 21.03.) 15-19.06. складзецца ў цябе ўражанне, што цябе ахоўвае анёл ахоўнік або вядзе па дарозе жыцця вышэйшая сіла. Адкрыеш, што ведаеш больш, чым табе здавалася. Навучышся супрацоўніцтва з іншымі пры захаванні поўнай незалежнасці і свабоды. Грошай хопіць! Фундані сабе нейкія кайфовыя лахманы на канікулы!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960